Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і КК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 10 1931 г. СУБОТА № 34 (4837) Год выдання XVII

Бібліятэка В. І. Леніна

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СВОЕЧАСОВА І ДОБРАЯКАСНА ЗАВЯРШЫЦЬ РАМОНТ ТРАКТАРОЎ

Пад соцыялістычную гаспадарку БССР партыяй падведзена магутная соцыялістычная база. У наступнаму вясну на соцыялістычных палях Беларусі будуць працаваць звыш 2.000 трактароў.

Правадыр нашай партыі тав. Сталін у сваім гістарычным дакладзе на XVII партыйным з'ездзе адзначыў: «Што датычыць скарыстання трактароў і машын, то неабходнаю становішча гэтай справы да таго ясна і агульнавядома, што не патрабуе доказаў».

Гэта ўказанне правадыра ў вялікай меры датычыць БССР. Агульнавядома, што ў мінулым годзе трактарны парк БССР скарыстоўваўся самым агідным спосабам. У большасці МТС кафіцыент карыснай работы трактароў не перавышае 23 проц. Ёсць нават такая МТС, як **Чавуская**, дзе трактарны парк ухітрыліся скарыстаць на... 1 проц.

Адной з асноўных прычын дрэннага скарыстання трактарнага парку з'яўляецца несвоечасовы і надобракасны рамонт.

У БССР на 5 лютага адрамантавана 880 трактароў—54,5 проц. Абач з такімі МТС, як **Заслаўская, Рагачоўская, Слуцкая** і інш., якія поўнасцю скончылі рамонт трактароў, большасць МТС самым небыным чынам зрываюць тэрміны рамонту, вызначаныя партыяй і ўрадам, а **Лёзненская, Пухавіцкая, Дубровенская** і **Жыткавіцкая** МТС выканалі план рамонту не больш, чым на 10 проц.

Пры нездавальняючым ходзе выканання выканання плана рамонту трактароў, асабліва пагражаючым з'яўляецца становішча з рамонту.

Партыя зрабіла ўсё неабходнае для таго, каб МТМ і МТС маглі бесперабойна і з поспехам праводзіць рамонт, забяспечыла майстэрні абходным абсталяваннем і рабочай сілай. Як скарыстоўваюцца гэтыя магчымасці, можна прасачыць на прыкладзе **Полацкай** МТМ.

Полацкая майстэрня знаходзіцца на новa-абсталяваным памяшканні, мае патрэбную колькасць варштатаў, забяспечана высокакваліфікаванай рабочай сілай, але з месяца на месяц **ЗРЫВАЕ ГРАФІК РАМОНТУ.**

Асабліва ганебна яе становішча з якасцю рамонту. **Боркавіцкая** МТС нядаўна прыняла ад Полацкай МТМ тры маторы. Пры іспытанні аказалася, што **НІ АДЗІН З ІХ НЕ ПРАЦУЕ.** Гэты выпадак не выключэнне. Выпушчаныя 5 лютага два маторы таксама аказаліся нягодны для работы.

Яшчэ горшая справа ў **Віцебскай** МТМ. Па колькасці адрамантаваных трактароў яна знаходзіцца па адным з апошніх месц, выканаўшы план усяго на 23,9 проц. Для характарыстыкі якасці яе работы даволі прывесці дзве лічбы: з адрамантаваных на працягу трох месяцаў 40 матораў, **35 аказаліся нягоднымі.** Такія-ж паказальнікі работы даюць **Аршанская** і **Дамانавіцкая** МТМ.

У чым-жа прычыны такога становішча? І на гэта пытанне лепш за ўсё дае адказ практыка работы Віцебскай МТМ. Працоўны дзень рабочых на зборцы матораў фактычна складае **адну гадзіну.** Гэта нязвычайна, але факт. Рабочыя прастойваюць з-за таго, што адміністрацыя не паклапацілася своечасова адрамантаваць варштат для прыжыгу падшыпнікаў. Каб атрымаць якую-небудзь дэталь, рабочыя павінны па некалькі раз бегчы ў кладовую і чакаць там гадзінамі. Аб ударніцтве і спаборніцтве ў гэтай майстэрні і гаварыць не прыходзіцца.

Праверка прадукцыйнасці працы, праведзеная ў **Гомельскай** МТМ, якая лічыцца перадавой, паказвае, што як правіла загрузка працоўнага дня ў майстэрні **НЕ ПЕРАВЫШАЕ 5 ГАДЗІН.**

На што-ж траціцца астатні час?

Рабочы майстэрні **Шылаў** 28 студзеня патраціў больш гадзіны толькі на атрыманне наряда на работу. Па выпіску і атрыманне запасных частак ён патраціў 50 мінут, на адшуканне інструментаў 45 мінут. І гэта, паўтараем, у адной з лепшых МТМ!

Адсутнасць усякай арганізацыі працы, расхлябанасць прыводзяць да заляпаду працоўнай дысцыпліны. Справа даходзіць да таго, што ў Дамانавіцкай МТМ спазнен ні на 1-2 гадзіны лічацца зусім нармальнымі, **супроць зрыўшчыкаў працоўнай дысцыпліны ніякіх мер не прымаецца.**

Адсутнасць належнага тэхнічнага нагляду з'яўляецца асноўнай прычынай нядобраякаснага рамонту. Такое праспешнае мерапрыемства, як бракераж вырабляемых ні. Даволі было Гомельскай МТМ давесці заданне да брыгады, да варштата, устанавіць правільны графік работы і жорсткі кантроль за яго выкананнем, каб за адну пяцідзеўку выкапаць 12,4 проц. на МТМ дэталяй, амаль нідзе не праводзіцца. У большасці МТМ прыёмка адрамантаваных матораў робіцца **БЕЗ ПАПЯРЭДНЯЙ ПРАВЕРКІ.** Годнасць матораў устанаўляецца толькі тады, калі МТС яго прыняла і паставіла на трактар. Гэта параджае безадказнасць за якасць рамонту і абязлічку.

Не малую віну за становішча, якое стварылася, нясуць **Белсельгаснаб і Белсельснабрамонт.** На іх ускладзена адказнейшая задача — забеспячэнне МТМ і МТС запаснымі часткамі і матэрыяламі для рамонту трактароў.

Рамонтная кампанія ў гэтым годзе, як ніколі, забяспечана запаснымі часткамі. Між тым рад МТМ прастойваюць з-за адсутнасці запасных частак. Прычына гэтага аказваецца ў тым, што Белснабрамонт механічна самым бюракратычным чынам размяркоўваў гэтыя запасныя часткі. У той час, як адным МТМ адгружаецца адразу 80 проц. патрэбных частак, другія МТМ атрымліваюць 30-35 проц. Больш таго, вялікая колькасць запасных частак, патрэбных МТМ, часта пралежваюць на заводах толькі таму, што заказчык — Белснабрамонт несвоечасова іх выкупляе.

Як-жа рэагуе на такое становішча з ходам рамонтнай кампаніі Наркамзем? Ён здавальняецца тым, што склаў план рамонту, да рэчы, з вялікім спазненнем, і разаслаў яго па месцы. Аб якасці гэтага планавання мы ў свой час пісалі. Усё далейшае кіраўніцтва з боку Наркамзема абмяжоўваецца толькі складаннем зводак.

Перадавыя МТМ і МТС паказалі, як трэба дабівацца перамогі. Галоўнае заключаецца ў аператыўным канкрэтным кіраўніцтве кожным участкам работы майстэрні плана гадавога рамонту.

З вялікім уздымам творчай актыўнасці сустрэлі рабочыя МТМ з'езд нашай партыі. Там, дзе кіраўніцтва МТМ і МТС здолела скарыстаць гэту актыўнасць, там мы маем пэўныя поспехі ў ходзе рамонту. Але большасць МТМ і МТС не ўзначалілі вытворчага энтузіязму рабочых, каб на вопыце перадавікоў вучыцца перамагаць.

«Пытанне аб асваенні ў сельскай гаспадарцы тых машын, якія краіна дае сельскай гаспадарцы, з'яўляецца адным з самых вострых на працягу бліжэйшага адрэзку часу. Поўнае асваенне машын узнімае ўраджайнасць на больш высокую ступень і забяспечвае каспяховую барацьбу за тую ўраджайнасць, якая неабходна нам у другім пяцігоддзі» (**Рудзутак**).

У вырашэнні гэтай адказнейшай задачы рашаючую ролю набывае своечасовае і добраякаснае завяршэнне рамонту трактароў.

Чырвоная армія дэманструе ў гонар XVII партз'езда

ПАРАД НА КРАСНАЙ ПЛОШЧЫ

Дэлегаты XVII з'езда партыі, якія прыехалі з усіх канцоў вялікага Саюза, учора на Красной плошчы знаёміліся з узброенымі сіламі краіны, якімі вокам праверылі становішча абароны СССР. ГЭТА БЫЎ АГЛЯД ГАТОВАСЦІ БОЛЬШЭВІЦКАЙ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦІ КРАІНЫ. ПАРАД ВЫСОКАЙ ТЭХНІКІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, ДЭМАНСТРАЦЫЯ ВЕЛІЗАРНЫХ ПЕРАМОГ ПЯЦІГОДКІ Ў АЎЛАДАННІ ГЭТАЙ ТЭХНІКАЙ.

***

К 12 гадзінам дня трыбуны на Красной плошчы поўны дэлегатамі з'езда. Тут-жа шматлікія госці — прадстаўнікі заводаў і фабрык сталіцы.

Прыходзяць прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, ваенныя аташэ.

Строгія шарэнгі войск стаяць нерухома, чарнеюць шчыльныя чатырохкутнікі маракоў. Быстра прабягаюць пінейныя, па радах раздаецца дзьвяк чутная каманда.

ЗА 7 МІНУТ ДА 12 ГАДЗІН К ТРАЎЗАЛЕЮ ПАДЫХОДЗЯЦЬ ТАВ. СТАЛІН У СУПРАВАДЖЭННІ ЧЛЕНАЎ ПАЛІТБЮРО. Адразу бурнымі апладысментамі разражаюцца трыбуны, дружнымі—магутнымі трывітаннямі «НЯХАЙ ЖЫВЕ Т. СТАЛІН», «НЯХАЙ ЖЫВЕ ЦК НАШАЙ ПАРТЫІ», «УРА!»

***

Камандуючы парадам т. КОРК аб'язджае бясконцыя рады войск. Але ёсць гадзінник. Спаскай вежы адбівае 12. На адно імгненне на плошчы наступае ўрачыстая цішыня. На лесвіцы крыла маўзалея тт. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, КАЛІНІН, ДЗЕРЖАНСКІЙ, КУЙБЫШЭЎ, АРДЖАНІКІДЗЕ, КУЙБЫШЭЎ, АНДРЕЕЎ, МІКАЯН, КАСІОР, КІРАЎ, ГАМАРНІК, ЧУБАР, ШКІРАТАЎ і інш. На правым крыле маўзалея—Рэвваенсавет СССР.

З апошнім ударам крэмлёўскага гадзінніка раздаюцца гучныя гукі аркестраў, вітаючы выехаўшага з варотаў варот т. ВАРАШЫЛАВА. У шарэнгах войск грымяць «УРА». Камандуючы парадам т. КОРК рапортуе наркому:

— Тав. народны камісар па ваенных і марскіх справах. У гонар XVII з'езда Усесаюзнай Камуністычнай партыі большэвікоў войскі маскоўскага гарнізона і ўзброеныя атрады пролетарыята пастроены для парада.

Зноў гулка разносіцца «ура». Тав. Варашылаў у суправаджэнні тав. Корка аб'язджае войскі, і водгукі далёкай шумнай прывітальнай хвалі паказваюць іх шлях. «Ура» то за тухае, то зноў аднаўляецца з новай сілай. Вось прывітанні сталі аглушальна гучнымі. Тав. Варашылаў вярнуўся пасля аб'езда войск.

— Вольна! — раздаецца камада.

Падняўшыся на трыбуну маўзалея, т. Варашылаў гаворыць прамову, рапартуючы партыі ў асобе яе XVII з'езда аб магутнасці Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, аб непахіснасці РСЧА, аб яе вернасці вялікай партыі і вялікаму правадыру СТАЛІНУ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ НЕПЕРАМОЖНАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ!

У заключным словы прамовы тав. Варашылава ўрываюцца гарматныя салюты. Раскаты змяняюцца грамавым «ура», велічным гімнам сусветнага пролетарыята—«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛАМ».

***

Гучаць фанфары.

— Парад, зважай! — разносіцца па плошчы каманда.

Урачысты марш пачынаюць слухачы ваенных акадэмій: акадэміі імя ФРУНЗЕ, інжынернай, хімічнай, ваезнтраній, Пролетарскія палкі, пераводзцы шагаюць роўна і чотка, выклікаючы ўсеагульнае захапленне.

Воплескамі дружных апладысментаў вітаюць трыбуны камандзіраў марскога флота.

Самкнутым строем шагае пролетарская дывізія. Байцы плячом к плячу, з вінтоўкамі на перавес. Холодна паблісхваюць штыкі. Несакрушальнай сілай вее ад шчытных, моцных шарэнг.

А шарэнгі ідуць і ідуць. Ідуць пад марш аркестраў войскі АДПУ, пагранічнікі, чыгуначная ахова, суправісты, кулямётчыкі, снайперы, пёхотчыкі, дэманструючы велізарную вытрымку Чырвонай арміі, яе жалезную дысцыпліну.

Атрад маскоўскай міліцыі замыкае сабой калоны войсковых часцей. Узорная выпраўка міліцыі робіць на дэлегатаў з'езда і гасцей вялікае ўражанне.

***

Кароткі прамежак.

На трыбунах ажыўленне. Усе глядзяць у бок Гістарычнага музея. Чаканчы шаг, падходзяць чырвоныя партызаны, асобныя хімаўскія ўзброеныя атрады маскоўскага пролетарыята—плошчу ад плошчы, кроў ад крыві рабочых атрадаў, штурмаваўшых Крэмль у памятныя лістападаўскія дні 1917 г.

Дэлегаты і госці з захапленнем сустракаюць рабочыя атрады.

Лепшыя прадстаўнікі партыі, якія сабраліся на свой з'езд, радасна вітаюць узброены пролетарыят, заўсёды гатовы да абароны соцыялістычнай бацькаўшчыны—змяняць сваё рабочае месца на месца ў шэрэнгах бойцоў Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

***

Раптам цокатам конскіх капыт на паўняецца плошча. Гэта—конная артылерыя. Бясшумна слізгаюць гарматы на гумовым ходу. Эскадрон за эскадронам праходзіць кавалерыя. Услед—зноў артылерыя. За ёй імчацца тачанкі.

Гэтыя тачанкі, гэта конная артылерыя, гэтыя імклівыя эскадроны кавалерыі—прэлюдыя к параду магутнай сучаснай тэхнікі Чырвонай арміі, параду не багата матэрыяльных і механізаваных часцей. Іх магутны рух адкрывае буйны танк. Гаўпу байца горда ўзвышаецца над башынькай танка, пераможна разсяваецца маленькі чырвоны сцяг. А за гэтым танкам мноства самых разнастайных машын. Танкеткі, бронеаўтамабілі, пёгкія і цяжкія танкі, якія могуць ходзіць і па вадзе і ўзбірацца на горы, рушацца лавай, займаючы ўсю Красную плошчу.

І відаць, як са дня ў дзень, з месяца ў месяц расце ваенная магутнасць совецкай краіны, як з выключнай шпаркасцю ўдасканальваецца ваенная тэхніка Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі. СОВЕЦКІ САЮЗ ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў МАГУТНУЮ ІНДУСТРЫЯЛЬНУЮ КРАІНУ, ЯКУЮ НЕ ЗМОГУЦЬ ЗЛАМАЦЬ НІЯКІЯ ВАРОЖЫЯ Ў СВЕЦЕ СІЛЫ. СССР ЗДОЛЕН У МАСАВЫМ МАСШТАБЕ СТВАРАЦЬ УСЕ ВІДЫ СУЧАСНАЙ АБАРОНЫ. І парад танкаў, парад навейшай артылерыі, парад сталі і матораў—бліскучы таму доказ. Гэта ўжо ТЭХНІКА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ, за ажыццяўленне якой упарта змагаецца зараз вялікая партыя, уся краіна, усе працоўныя Совецкага Саюза.

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

Прамова тав. СТЭЦКАГА па дакладу тав. КАГАНОВІЧА

— Таварышы, XVII з'езд партыі пазван з'ездам перамог, але разам з тым ён з'яўляецца і з'ездам сама крытыкі. Гігантскія перамогі нашай партыі і працоўных мас знайшлі сваё бліскучае выяўленне ў дакладзе т. Сталіна і ў дакладах тт. Молатава і Кагановіча. І разам з тым гэтыя даклады былі сведчаннем той вялікай самакрытыкі, якую наша партыя праводзіць і на сучасным этапе. Інакш не можа быць.

Поспехі нашы вялікія, імі можна справядліва ганарыцца.

Але заданні, якія намечаны ў плане другой пяцігодкі, сапраўды грандыёзны. Для таго, каб іх выканаць, патрэбна гігантская работа па арганізацыі мас, па сканцэнтраванню іх намаганняў; патрэбна правер ка ды дапамозе самакрытыкі ўсіх звеньняў нашага апарата. Трэба нашы арганізацыі і наш апарат пабудаваць такім чынам, каб яны змаглі сапраўды кіраваць масамі ў штурме для завяявання бясклясавага грамадства. Трэба вызваліць гэты апарат, гэтыя арганізацыі ад усякай пухліны, лішніх нарастаў. Трэба паставіць правільна кіраўніцтва гаспадарчымі органамі, усім будаўніцтвам, каб выканаць гэтыя велізарныя задачы. Гэтага нельга зрабіць інакш, як пры дапамозе самакрытыкі. Самакрытыка — гэта зарука дзейснасці, зарука сілы ўсіх нашых арганізацый. І калі перайсці да той работы, аб якой тут так сама даволі многа гаварылася — да работы выхаваўчай, да работы прапагандысцкай, то трэба і ў гэтай галіне з усёй сілай скарыстаць самакрытыку.

Зараз, на даным этапе, перад намі асабліва чотка выяўляецца выхаваўчы бок пролетарскай дыктатуры. Самы трудны этап астаўся ззаду. Класавы вораг разгромлен. Нам яшчэ трэба яго біць і дабіваць. Але перад намі стаіць ва ўсім абёме задача перамагання перажыткаў капіталізма не толькі ў эканоміцы, але і ў сазнанні людзей. Гэта значыць, што выхаваўчая работа, выхаваўчы бок дыктатуры пролетарыята, аб якім гаварыў т. Сталін — ён зараз асабліва вылучаецца. І тут партыя, як і ва ўсіх іншых пытаннях, павінна быць наперадзе.

Знаходзіліся «тэарэтыкі», якія лічылі, што ў сувязі з тым, што перад намі цяпер непасрэдна стаіць задача пабудовы бясклясавага грамадства, то нібыта неяк умаляюцца і роля партыі і роля пролетарскай дыктатуры. Гэта, таварышы, чысцейшае глупства. Іменна цяпер, калі перад намі стаіць задача выхавання новых слаёў, калі перад намі стаіць задача перамагання перажыткаў капіталізма ў сазнанні людзей, роля нашай партыі, роля кожнага комуніста асабліва ўзмацняецца; перад кожным комуністам і перад усёй партыяй высоўваюцца асабліва павышаныя патрабаванні. Калі з пункту гледжання гэтых павышаных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца зараз комуністу ў справе арганізацыі мас, у справе кіраўніцтва імі, паглядзець на становішча нашай выхаваўчай работы, на тое, як мы падрыхтоўваем комуніста да кіраўніцтва масамі, да таго, каб ён усвойваў асновы комунізма, асновы нашай палітыкі, каб ён быў прыкладам добравольнай, свядомай дысцыпліны і комуністычных адносін да працы, — то трэба, таварышы, прама сказаць, што справа тут у нас пастаўлена нездавальняюча, і ў гэтых адносінах тая крытыка, якая была і ў дакладзе т. Сталіна, і ў дакладзе т. Кагановіча і ў выступленні т. Кірава, — зусім справядліва. Наша выхаваўчая работа пастаўлена нездавальняюча.

Трэба з усёй сур'ёзнасцю падкрэсліць, што ў справе выхаваўчай работы, як і ва ўсіх іншых галінах, пытанні арганізацыі маюць велізарнейшае значэнне. Трэба пакончыць з поглядам на прапагандысцкую работу, як на такую работу, дзе людзі толькі размаўляюць і толькі пішуць артыкулы і кнігі. Гэта, таварышы, глупства. Ад гэтага трэба асабліва адмовіцца зараз, калі ў сувязі з усёй велічнасцю нашых задач трэба паставіць як след і справу прапаганды. Ахапіць масы партыі, ахапіць масы працоўных выхаваўчай работай ёсць таксама, перш за ўсё, арганізатарская работа. А вось, калі з гэтага пункту гледжання падыйсці да таго, што ў нас робіцца на гэтым участку, то я вам павінен сказаць, што тут у нас у сэнсе арганізацыі справы стаіць горш, чым у якой-бы там ні было іншай галіне партыйнай работы.

Кагановіч: Правільна!

Стэцкі: Горш. І павінен вам сказаць, што і балбатуноў тут больш, чым у якой-бы там ні было іншай галіне партыйнай работы. Гэта вы, таварышы, усе вельмі добра ведаеце. Гэтага ніхто не можа адмаўляць. Гэтаму дапамагаў і той погляд, што гэта ёсць, перш за ўсё, справа разгавораў, справа якасці другарадная. Вядома, нельга прадстаўляць рэчы такім чынам, што ўсе галіны культурнай работы адсталі, нельга ўсе іх красіць чорным. Гэта было-б няправільна, гэта было-б перагібам. Ёсць у нас і добрыя ўзоры на асобных участках работы.

Кагановіч: Ці толькі-ж на асобных участках? Ёсць у нас добрыя ўзоры ў радзе галін культуры.

Стэцкі: Ёсць галіны і арганізацыі, дзе работа пастаўлена добра. У гэтым годзе ў нас адбывалася праверка пастаноўкі справы прапаганды. І павінен вам сказаць, што ў цэлым радзе арганізацый у гэтых адносінах ёсць вялікія поспехі.

Ёсць, аднак, вобласці, дзе работа вядзецца пастарыцы. Я павінен прад'явіць тут прэтэнзіі Сярэдняй Волзе і ў асаблівасці, таварышы, Ніжняй Волзе, хоць я не ведаю, да каго мне зварачацца — ці да тав. Птуха, ці да тав. Штэрнберга: яны падзяліліся. Ва ўсякім выпадку праверка паказала, што там сетку партыйнай асветы прабуюць ставіць шляхам агульных рэзалюцый, агульных указанняў з абкома, што там няма яшчэ сапраўднай арганізатарскай работы, там няма сапраўдных клопатаў аб тым, каб забяспечыць кожнага партыйца палітграматай і падручнікам. Нам неабходна трэба расправіцца і тут са старымі метадамі работы.

Я вас прашу, таварышы, толькі аб адным. Калі вы пачнеце выконваць указанні тав. Сталіна і называць «сумленных балбатуноў» ад кіраўніцтва асобнымі галінамі работы, то я прасіў-бы вас не забываць і аб гэтай галіне работы. Тут таксама трэба ачысціцца ад балбатуноў, для таго каб як след паставіць справу выхавання, справу прапаганды, якая з'яўляецца адной з важнейшых задач нашай партыі ў сучасны момант.

Кагановіч: Правільна!

Стэцкі: Вы не забывайце, таварышы, што іменна гэты ўчастак з'яўляецца адным з тых, дзе фармуецца сазнанне партыйца. Нельга сказаць, каб яго сазнанне фармавалася толькі ў школе, але гэта работа, работа па вывучэнню асноў марксізма, работа па вывучэнню нашай партыйнай палітыкі, работа па вывучэнню задач соцыялістычнага будаўніцтва, з'яўляецца адной з важнейшых, і нам трэба, у асаблівасці ў сучасны момант, паставіць яе на вышыню.

Я хацеў-бы, таварышы, сказаць яшчэ, што нам трэба гэту галіну культурнай работы падмацаваць і ў адносінах матэрыяльнай базы—перш за ўсё па частцы паперы. Прадстаўнікі з месц амаль усе патрабуюць паперы. Кожны падходзіць і гаворыць, што паперы адпускаецца недастаткова. Нам трэба падняць, павялічыць вытворчасць паперы. Ніякіх асаблівых затрат для гэтага нам непатрэбуецца: лесу ў нас колькі хочаце, сырцу ў нас колькі хочаце.

Тое-ж самае і ў адносінах паліграфіі. Паліграфія ў нас зношаная. Гэту галіну нам таксама трэба развіваць.

І, нарэшце, я павінен сказаць адносна радыё, якое мае велізарнейшае культурнае значэнне. Аб гэтым не варта многа расказваць, бо вы ўсе ведаеце, што значыць радыё. Яно паведамляе і апошнія навіны, і артыкулы, і даклады, і разам з тым можа даставіць прыемнасці куды больш чым патэфон, аб якім з такім энтузіязмам гаворыць тав. Пятакоў. І больш таго, радыё дае велізарныя тэхнічныя магчымасці для канкрэтнага кіраўніцтва раёнамі. Я ўжо не гавару аб тым, што радыё дае нам магчымасць у самы найкарацейшы тэрмін, калі гэта трэба паставіць на ногі ўсю нашу краіну, падняць, мабілізаваць яе. І таму аб гэтай галіне мы павінны зараз пасапраўд наму паклапаціцца.

Тав. Сталін, выступаючы тут, гаварыў, што нам ні ў якім разе нельга аслабляць нашу партыйную пільнасць і пасцярожанасць. Бо ў нас ёсць яшчэ астаткі ўхілаў, іх карэнчыкі. Правільнасць указання тав. Сталіна, што нам у гэтых адносінах ні ў якім разе разслабляцца нельга, пацвярджаецца радам прыкладаў. Яшчэ не так даўно некаторыя з нашых эканамістаў прабавалі будаваць тэорыю эканомікі пераходнага перыяду, выкладаць нашу эканоміку такім чынам, што ў іх знікала асноўнае пытанне аб дыктатуры пролетарыята. Яны прабавалі нашу эканоміку разглядаць, як некаторую рэч у сабе, як некаторую асобную галіну, зне і незалежна ад дыктатуры пролетарыята, такім-жа манерам, як разглядаецца капіталістычная эканоміка.

Што гэта такое? Гэта, таварышы, астаткі тэорый, якія развіваў Бухарын і Прэабражэнскі, лічыўшы, што мы павінны нашу эканоміку разглядаць па аналогіі з капіталістычнай, што ў нашай эканоміцы дзейнічаюць якіясці ад нас зусім незалежныя законы, якія вызначаюць яе рух. Яны абыходзілі тое асноўнае, што складае характэрную рысу нашай эпохі, абыходзілі дыктатуру пролетарыята, ад якой усё выходзіць, якая з'яўляецца тым вагаром, які змяняе і рушыць нашу эканоміку, які перабудоўвае грамадства і без якога нічога нельга зразумець у нашым будаўніцтве, у нашай эканоміцы, ва ўсім нашым грамадскім жыцці.

Другі момант, таварышы. Улетку гэтага года некаторыя інстытуты Комакадэміі абмяркоўвалі пытанне аб адміранні дзяржавы. Гэта было пасля выступлення т. Сталіна на студзеньскім пленуме ЦК, дзе ён гаварыў аб тым, што нам трэба ўзмацняць нашу пролетарскую дыктатуру. А некаторыя «тэарэтыкі» выставілі палажэнне аб тым, што наша пролетарская дзяржава пачала адміраць ні больш ні менш як па другі-ж дзень пасля Окцябрскай рэволюцыі, што яна, значыць, адмірала ўсё гэтыя 16 год, так што дзіўна, як яна наогул існуе ў сучасны момант.

Адкуль выцякала такая пастаноўка пытання? З няправільнага тлумачэння палажэння Уладзіміра Ільіча аб тым, што наша дзяржава з'яўляецца ўжо поўдзяржавай, што наша дзяржава з'яўляецца адміраючай дзяржавай. Так гэта факт, але гэта яе жыццёвая мэта, гэта назначэнне пролетарскай дзяржавы. Для таго, каб дасягнуць гэтага, наша дзяржава павінна правесці велізарную работу па перабудове ўсёй эканомікі, па знішчэнню класавых ворагаў, па знішчэнню класаў, велізарную работу па ўцягванню ўсіх мас ва ўдзел у кіраванні дзяржавай, па выхаванню самадысцыпліны і комуністычных адносін да працы.

Вось як ставіцца пытанне аб адміранні дзяржавы. Глыбока памыляліся таварышы, прабуючы паказаць справу такім чынам, што пролетарская дзяржава пачынае ўжо адміраць па другі-ж дзень пасля пролетарскай рэволюцыі. Яны забылі палажэнне Леніна аб тым, што ў пераходны перыяд дзяржава патрэбна пролетарыяту, што дзяржава адмірае толькі пры комунізме. Яны забылі палажэнне Сталіна аб тым, што шлях да адміравання пролетарскай дзяржавы ляжыць праз яе ўзмацненне. Усе гэтыя разгаворы адносна адміравання льюць ваду на млын апартуністаў, на млын тых, хто хацеў супакоіцца на дасягнутых рэзультатах, хто прабаваў нас разсвяціць перад тварам барацьбы з класавымі ворагамі.

Таварышы, мы павінны добра сабе ўявіць тое, што, уласна гаворачы, адбываецца. Трэба з усёй вы разнасцю і глыбінёй усвядоміць, што план другой пяцігодкі азначае, што мы заканчваем другую трудней шую задачу, якая стаяла перад пролетарыятам. Першая задача заключалася ў тым, каб захапіць уладу, каб заваяваць дыктатуру пролетарыята. Другая задача—не менш, а бадай больш складаная—заключалася ў тым, каб ажыццявіць пераход ад капіталізма к соцыялізму. І вось у другой пяцігодцы, у гады, якія нам астаюцца — 1934, 1935, 1936, 1937 — мы, таварышы, заканчваем і вырашаем другую задачу пролетарыята, задачу сусвет на-гістарычнага значэння: мы заканчваем **пераходны перыяд.**

Вядома, могуць і тут знайсціся ўсякага роду «тэарэтыкі», якія зараз пачнуць мудраваць, спрачацца, дыскусіраваць па повану таго, у які іменна дзень 1937 года, у якую гадзіну, уранку ці ўвечары, у нас з'явіцца бясклясавае грамадства. Такіх талмудзістаў трэба гнаць як можна далей ад нашых арганізацый і ў дыскусіі з імі не ўступаць. Іх трэба выкрываць.

Перад намі стаіць пытанне палітычна. Мы ведаем, што калі мы другі пяцігадовы план выканаем, то задача пабудовы соцыялістычнага грамадства будзе ажыццёўлена.

Трэба, таварышы, паставіць сёння і пытанне аб тым, як гэта здарылася, якой барацьбой гэта было падрыхтавана і забяспечана. І тут, мне здаецца, трэба было-б успомніць аб тым, што было на 15-й канферэнцыі нашай партыі, калі было пастаўлена ва ўвесь рост пытанне аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў нашай краіне. Тады трацкісты і зіноўеўцы павялі атаку на гэта палажэнне, прычым яны чапляліся за некаторыя старыя выказванні Энгельса аб тым, што соцыялістычная рэволюцыя магчыма толькі як адначасовая рэволюцыя ў цэлым радзе перадавых краін. Гэта палажэнне Энгельса асноўвалася на аналізе тагочасных умоў і тагочаснага становішча капіталізма. Трацкісты чапляліся за гэтыя палажэнні, прабуючы, такім чынам, павярнуць марксізм назад. Але гэта ім не ўдалося.

Тав. Сталін, які разгарнуў палажэнне Леніна, які выходзіў не з літары марксізма, а кіруючыся марксіцка-ленінскім метадам, даў бліскучы аналіз тых змен, якія адбыліся ў сучасным капіталізме, — тав. Сталін з усёй канкрэтнасцю і глыбінёй паставіў пытанне аб магчымасці перамогі соцыялізма ў адной краіне і тэарэтычна, і практычна як праграму работы сёнешняга дня. Ім не толькі былі адбіты ўсе атакі трацкістаў, але ён разгарнуў ва ўсім абёме тэорыю аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў адной краіне. Гэта тэорыя зараз з'яўляецца адным з краевугольных камняў нашай рэволюцыйнай тэорыі. Гэта тэорыя становіць сабой уклад у скарбніцу марксізма-ленінізма. Яна натхняла нашу партыю.

Але, таварышы, справа не толькі ў гэтым. У работах т. Сталіна для ўсіх нас, для ўсіх пролетарыяў і працоўных усіх краін, дана самая глыбокая тэорыя і сканцэнтраваны самыя глыбокія ўрокі і ўказанні таго, як трэба будаваць бясклясавае грамадства. Гэта тэорыя і гэтыя ўказанні праверана практыкай грандыёзнай соцыялістычнай будоўлі, якою канкрэтна і пабаявому кіраваў і кіруе т. Сталін штодзённа і штогадзінна. І ў гэтым асаблівая веліч таго велізарнага тэарэтычнага ўкладу, які ён зрабіў у скарбніцу марксізма.

Вазьміце вы такія факты і такія палажэнні, як палажэнні аб індустрыялізацыі краіны, аб калектывізацыі, аб ліквідацыі кулацтва, як класа. Былі-ж людзі, напрыклад, якім здавалася, што такая справа, як арганізацыя калгасаў — рэч простая і нятрудная. Але гэта справа партыяй, пад кіраўніцтвам т. Сталіна, была глыбока ўзважана тэарэтычна ў сувязі з вывучэннем усёй абстаноўкі, глыбока і доўга правяралася практычна. Трэба было знайсці такую форму калгаса, якая па дапай ступені адпавядала-б інтарэсам сялянства і разам з тым задачам яго пераходу да соцыялізма. Тое-ж самае мы маем літаральна і ва ўсіх іншых пытаннях пролетарскай дыктатуры і соцыялістычнага будаўніцтва.

Ленін гаварыў, што наша будаўніцтва павінна быць узорам для ўсіх. І, таварышы, узяўляючы сабе на XVII з'ездзе тое, што адбылося, мы павінны сказаць, што наша партыя выканала свае задачы, як авангард міжнароднай пролетарскай рэволюцыі, яна стварыла гэты ўзор для ўсіх. Цяпер мы можам з гонарам сказаць пролетарыям усіх краін: вось глядзіце, тут вы бачыце тэорыю і практыку таго, як трэба не толькі заваёўваць уладу, але і як трэба будаваць бясклясавае соцыялістычнае грамадства.

Трэба адзначыць, як зараз буржуазія і буржуазная прэса рэагуе на другую пяцігодку, як яна адгукаецца аб гэтай другой пяцігодцы. Вы помніце, як была спаткана першая пяцігодка. Падняслася цэлая хваля крыкаў і прадказванняў аб тым, што гэта міф, фантазія, што ніякага чорта не выйдзе, што гэта пустая зацея, што большэвікі праваляцца. Цяпер такіх крыкаў і такога лямянту нешта не чуваць. Чаму? Таму, што мы прабілі ілбы, мы даказалі пават цвёрдалобым буржуа, што мы сапраўды можам будаваць і пабудуем тое, што захочам. Яны аб'яўлялі фантазіяй соцыялістычную рэволюцыю, але соцыялістычная рэволюцыя адбылася. Яны аб'яўлялі фантазіяй, што большэвікі ўтрымаюць уладу, а большэвікі 16 з лішнім год трымаюць уладу і цяпер нямерна мацней, чым калі-б там ні было. Яны аб'яўлялі фантазіяй першую пяцігодку, але першая пяцігодка ажыццёўлена ў чатыры гады. І цяпер, калі справа дайшла да самай вялікай фантазіі з пункту гледжання буржуазіі, да таго, што праз 4 гады на адной шостай земнага шара з'явіцца бясклясавае соцыялістычнае грамадства, — у іх, таварышы, ужо не хапае пораху для паклёпу, у іх ужо не хапае духу паклёпнічаць. Хопіць, яны апякліся і асеклісь, яны сілай фактаў вымушаны лічыцца з тымі грандыёзнымі планамі, якія мы ў сучасны момант высоўваем.

Справа соцыялізма, таварышы, паднята на небывалую вышыню; яна, як сонца, з'яе ў сучасны момант перад вачыма ўсіх працоўных, і ніякія хмары буржуазнага паклёпу не могуць засланіць гэта сонца.

Няхай жыве **XVII з'езд** — з'езд перамог!

Няхай жыве Сталін — вялікі арганізатар перамог комунізма!

(Апладысменты)

НІЧ.

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

9 ЛЮТАГА НА КРАСНАЙ ПЛОШЧЫ У МАСКВЕ АДБЫУСЯ ПАРАД ВОЙСК ЧЫРВОНАЙ АРМІІ У ГОНАР XVII З'ЕЗДА

ЗАГАД РЭВОЛЮЦЫЙНАГА ВАЕННАГА СОВЕТА СССР

г. Масква **№ 24** **9 лютага 1934 года**

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі.

Перад тварам XVII з'езда нашай большэвіцкай партыі Работа-Сялянская Чырвоная армія дэманструе сёння сваю беззаветную адданасць справе сацыялізма, сваю баявую магутнасць, сваю гатоўнасць у любую мінуту і супроць любога ворага выступіць для пераможнай абароны сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Звыш 30 год стаіць партыя большэвікоў, створаная вялікім Леніным, на чале рэвалюцыйнага рабочага руху. Рабочы клас праводзіў сваю партыю ў шматгадовай барацьбе супроць усіх ворагаў пролетарскай справы. Працоўныя Савецкага Саюза і ўсяго свету ведаюць нашу комуністычную партыю, як партыю бясстрашных пролетарскіх рэвалюцыянераў, як партыю, якая ведае, куды весці справу і ўмее перамагаць труднасці. Баявыя сцягі ленінскай партыі пераможна развіваліся над окцябрскімі барыкадамі і на палях грамадзянскай вайны. Пад гэтымі сцягамі, пад кіраўніцтвам найвялікшага чалавека нашай эпохі — **Сталіна**, працоўныя йшлі ў пераможнае сацыялістычнае наступленне і перамагалі.

XVII з'езд комуністычнай партыі ўвойдзе ў гісторыю сусветнай барацьбы за комунізм, як з'езд маналітнага большэвіцкага адзінства, як з'езд найвялікшых сацыялістычных перамог. У шуме і грукоце вялікіх работ, у гераічнай напружанасці вызваленай працы, у жорстких класавых баях пабудаван фундамент сацыялізма ў нашай краіне. **Сацыялізм у нашай краіне пераможа.**

Перад усім светам разгорнут баявы сцяг другой пяцігодкі — вялікая праграма пабудовы бясклаасавага сацыялістычнага грамадства.

Наша партыя была заснавана Леніным, як партыя ўзброенага паўстання, як партыя бітваў і перамог, як партыя класавай вайны. Лепін настойна вучыў рабочы клас, што вялікія пытанні класавай барацьбы вырашаюцца ў канчатковым выніку толькі сілай зброі. Ленінская партыя з першых дзён яе існавання рыхтавала пролетарыят па ўзброенай барацьбы, стройла яго першыя баявыя атрады, паклаўшыя пачатак нашай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. «Узмоцненая ваенная падрыхтоўка для сур'ёзнай вайны, — вучыў Лепін, — патрабуе не парыву, не клічу, не баявога лозунга, а доўгай, напружанай, упорнейшай і дысцыплінаванай работы ў масавым маштабе».

На барыкадах 1905 года, у партызанскіх баявых дзеяннях, у нарыўнай барацьбе з царскімі войскамі кавацся і раслі нашы баявыя большэвіцкія кадры. Шматтадовая работа ленінскай партыі па арганізацыі ўзброеных сіл рабочага класа падрыхтавала і забяспечыла вялікую перамогу пролетарыята ў окцябрскія дні 1917 года. Чырвоны сцяг баявых большэвіцкіх атрадаў, перанесены праз бані і пажарышчы першай рускай рэвалюцыі, увенчаны бессмертнай славай Окцябра, — пераможна разгарнуўся над рэгулярнымі палкамі рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, створанай пад кіраўніцтвам найвялікшага генія рэвалюцыі, правадыра працоўных і прыгнечаных усяго свету — **В. І. Леніна.**

У класавых бітвах на шматлікіх франтах грамадзянскай вайны, калі сілай зброі вырашалася пытанне аб лёсах пролетарскай рэвалюцыі ў нашай краіне, слаўная большэвіцкая партыя на чале з геніяльным Леніным стройла, выгоняла, скалочвала і вяла ў бой першую ў свеце Чырвоную армію, армію пераможнага пролетарыята. Сотні і сотні тысяч большэвікоў уліваліся ў рады Чырвонай арміі, мужна біліся ў перших радах, згуртоўвалі іх, узбройвалі ідэямі комунізма, уносілі ў армію непахісны дух жалезнай дысцыпліны і большэвіцкай упартасці і арганізаванасці.

Уся гісторыя Чырвонай арміі з першых дзён яе нараджэння неразрыўна звязана з імем вялікага рэвалюцыйнага стратэга, арганізатара, чалавека сталёвай волі, з імем любімага правадыра нашай партыі т. **Сталіна.** Ён быў на ўсіх фронтах, дзе рэвалюцыя пагражала небяспека. Усюды, дзе трабавалася несакрушальная воля, рэвалюцыйная мужнасць і жалезная ленінская цвёрдасць, дзе трабаваліся неадкладныя і рашучыя меры, партыя пасылала т. **Сталіна.**

Яго вуснамі 10 год таму назад над гробам Леніна партыя дала вялікую клятву — мацаваць несакрушальны аплот пролетарскай дыктатуры — Чырвоную армію. Гэта клятва з гонарам выканана.

Уся партыя, на ленінскі Цэнтральны Камітэт і асабіста т. Сталін з імя ў імя кавалі і куюць магутнасць Чырвонай арміі.

Адначасова з сацыялістычнай рэканструкцыяй краіны ішла тэхнічная рэканструкцыя нашых узброеных сіл. Разам з усёй краінай не пазнавальна змянілася і Чырвоная армія, узброеная цяпер перша-класнай ваеннай тэхнікай. Перша большэвіцкая пяцігодка, натхнёная сталінскім геніем, ператварыла нашу краіну ў непрыступную для варожых замахаў крэпасць, у непахісную твярдыню сацыялізма.

Магутная зброя новай баявой тэхнікі знаходзіцца ў умелых руках байцоў Чырвонай арміі, беззаветна адданых партыі Леніна-Сталіна, адданых вялікай справе сацыялізма. Учарашнія і заўтрашнія ўдарнікі большэвіцкіх калгасных і саўгасных палёў — сёння, у радах Чырвонай арміі, з энтузіязмам авалодваюць баявой зброяй. Сэрца кожнага байца, камандзіра і палітработніка Чырвонай арміі горача б'ецца тым-жа пафасам асваення тэхнікі якім жыве ўся краіна, які параджае небывалыя цуды працоўнага гераізму.

«Першы раз у гісторыі, — гаварыў Лепін у дні грамадзянскай вайны, — армія бугуецца на блізасці, на неразрыўнай блізасці, можна сказаць, на неразрыўнай злітнасці савецкай з атэніяй. Саветы яднаюць усіх працоўных і эксплаатуемых, — і армія бугуецца на пачатках сацыялістычнай абароны і свядомасці». На гэтых непахісных асновах пабудавана і вырасла Чырвоная армія. Неразрыўна яе сувязь з працоўнымі масамі і большэвіцкай партыяй. Пад кіраўніцтвам партыі Чырвоная армія, як першакласная большэвіцкая школа, выхоўвае ў сваіх радах не толькі стойкіх і смелых байцоў, але і свядомых перадавых будаўнікоў сацыялізма.

Чырвоная армія, як і ўся краіна, з захапленнем сустрэла гістарычны даклад тав. **Сталіна** на XVII з'езду ВКП(б). Ва ўказаннях нашага любімага правадыра і настаўніка Чырвоная армія черпае новыя сілы для далейшай барацьбы за авладанне баявой тэхнікай, навукай і культурай, для далейшага росту сваёй баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Словы тав. **Сталіна:** «Мы стаім за мір і адстойваем справу міру, але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць шарам на ўдар пашальчыкаў вайны» — выражаюць нашу непахісную волю па міру і нашу пастаянную гатоўнасць да абароны сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Чырвоная армія — адзіная армія ў свеце, прызначаная не для захватаў, не для заваявання чужых зямель. Разам з усёй краінай, разам з усёй нашай партыяй Чырвоная армія імкнецца да міру. Але наш меч адточан і гатоў парасіць усякага, хто пагрэбіць мірную працу сацыялістычнай краіны. Той, хто пасмее пераступіць нашы граніцы, будзе разгромлен да канца. Мы выкаваем гэту сталь пад нашым баявым большэвіцкім сцягам — пад сцягом класавай вайны і брацтва ўсіх працоўных.

Байцы Чырвонай арміі! Ад вашага імя вітаю XVII з'езд усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў. Ад вашага імя трапяталаю нашай партыі і яе вялікаму правадыру, любімаму настаўніку і другу Чырвонай арміі т. **Сталіну** — баявое чырвонаармейскае «ура».

Народны Камісар па ваенных і марскіх справах і старшыня РВС Саюза ССР ВАРАШЫЛАЎ.

ПРАМОВА ТАВ. МІКАЯНА ПА ДАКЛАДУ ТАВ. МОЛАТАВА

Тав. **Мікаян**, спатканы доўгімі апладысментамі, гаворыць:

— Таварышы, асаліва высокія патрабаванні, якія прад'яўляюцца ў другой пяцігодцы к росту прадукцыі лёгкай і харчовай прамысловасці, з'яўляюцца прамым рэзультатам паспяховага скančэння першай пяцігодкі.

Яшчэ на XVI з'ездзе партыі т. Сталін гаварыў: «... Цяжкую індустрыю мы ўжо аднавілі. Яе трэба толькі разгарнуць далей. Цяпер мы можам павярнуцца да лёгкай індустрыі і рушыць яе ўперад наскораным тэмпам». У сучасны момант, пабудаваўшы фундамент сацыялізма, магутную цяжкую прамысловасць і канчаткова перамогшы і замацаваўшыся калгасны лад у вёсцы, мы атрымалі тым самым магчымасць даць яшчэ большы разбег развіццю лёгкай і харчовай прамысловасці.

Па праекту пяцігадовага плана, які раздан вам на з'ездзе, намячаецца рост харчовай прадукцыі для 1937 года на 306 проц., супроць 1932 г. Ажыццявіць такую велізарную задачу патраення прадукцыі за пяцігодку харчовая прамысловасць можа толькі на аснове поўнай тэхнічнай рэканструкцыі наяўнай вытворчай базы і шырокага будаўніцтва новых магутных з першакласнай тэхнікай прадпрыемстваў. Для гэтага цяжкая прамысловасць павінна забяспечыць машынаснабжэнне усёй капітальнае будаўніцтва харчовай прамысловасці, а таксама забяспечыць значнае расшырэнне машынна-трактарнага парка, сыравой базы саўгасаў і калгасаў, якія выраслі і растуць. Наша цяжкая прамысловасць ужо на такім узроўні, што цалкам можа гэта забяспечыць. Трэба мець на ўвазе, што тэхнічная база харчовай прамысловасці, развіта ў меншай ступені, чым новая тэхнічная база металургіі і іншых галін цяжкай прамысловасці. Тут не толькі праблема асваення ўжо пабудаваных прадпрыемстваў, але адгачасова і праблема будаўніцтва новых і новых заводаў і іх асваення.

Геаграфічнае размяшчэнне новага будаўніцтва і вытворчасці прадукцыі харчовай прамысловасці мы абавязаны спалучаць з ростам рабочых цэнтраў у Сібіры, на Далёкім Усходзе і Урале. Намячаемае другой пяцігодкай стварэнне другога вугальнага Данбаса і магутных цэнтраў цяжкай індустрыі ў азіяцкай частцы СССР патрабуе таксама будаўніцтва на ўсходніх раёнах вялікай колькасці прадпрыемстваў харчовай прамысловасці.

З прычыны таго, што харчовая прамысловасць працуе на сырцу, які не церпіць вялікіх перавозак, мы адначасова павінны стварыць вакол новых прадпрыемстваў на ўсходзе дастатковую сырцовую базу. Апрача таго, мы павінны стварыць і падрыхтаваць новыя кадры, асабліва ў нацыянальных раёнах Казакстана і Кіргізіі, дзе прыходзіцца будаваць новыя мясакамбінаты, цукровыя і іншыя заводы. У сілу недастаткова спі яшчэ тэхнічнай базы харчовай прамысловасці, труднабыйнай не хуткага развароту і асваення ў новых раёнах Усхода, я лічу неабходным унесці прапанову з'езду аб прыняцці некалькі меншых лічбаў росту прадукцыі па некаторых галінах харчовай прамысловасці, чым намечана ў разданым вам праекце. Члены Палітбюро, з якімі я абменьваўся думкамі, падтрымліваюць гэту прапанову.

Па цукру праектам намечана для 1937 г. прадукцыі — 28 млн. цэнтнераў. Нават і пры прыняцці для 1937 г. 25 млн. цэнтн. цукру, мы атрымліваем супроць 8 млн. цэнтн. у 1932 г. рост у тры з лішнім разы. Сказаць, што гэта дрэнны тэмп, думаю, ніхто не можа, бо падняць прадукцыю цукровай прамысловасці ў тры разы — гэта значыць даць ёй велізарны разбег.

Уносячы гэту прапанову, я выходжу з наступнага. Магутнасць усіх наяўных цукровых заводаў у старых раёнах мы намячаем павялічыць, прыкладна, на 10 проц. шляхам іх рэканструкцыі. Пры гэтай умове ўсе гэтыя старыя заводы могуць даць у 1937 г. 20 млн. цэнтнераў цукру і толькі ў тым выпадку, калі штогодняя сярэдняя загрузка завода будзе складаць 125 дзён. Між тым за граніцай у сярэднім у годзе заводы загружаны каля 80 дзён. У нас ні ў адным годзе сярэдняя загрузка заводаў не перавышала 100 дзён. Для атрымання дадатковых 5 млн. цэнтнераў цукру мы абавязаны пабудаваць у другой пяцігодцы 55 новых цукровых заводаў. Новае будаўніцтва мы будзем ажыццяўляць не на Украіне, не ў заходняй частцы ЦЧВ, якія і так перагружаны тэхнічнымі культурамі і дзе перад намі стаяць задачы асваення існуючых цукровых заводаў, рэканструкцыі некаторых з іх і поўнай іх загрузкі сырцом. Новыя заводы мы будзем будаваць на Волзе, у Казакстане, Сібіры, Кіргізіі, на Далёкім Усходзе, на Паўночным Каўказе, у Закаўказзі.

Мы цяпер усе ведаем, у тым ліку і таварышы казакстанокія і кіргізскія, што мала яшчэ будаваць новыя заводы. Трэба іх асвоіць, а асваенне заводаў у новых раёнах патрабуе двух-трох год, бо трэба перабудаваць усю сельскую гаспадарку ў раёне цукровага завода, бо павінна быць асвоена складаная апаратура і тэхніка, створаны тэхнічна пісьменныя кадры на новым месцы.

Мы патрабуем ад т. Серго абсталявання. Тут выступала вельмі многа патрабоўных спажыўцоў, усе ад яго законна патрабуюць машыны, а яму не так лёгка ўсе патрабаванні задавальняць. Мы ў прыватнасці патрабуем для цукровай прамысловасці складанейшую апаратуру. Яе выробляюць тыя-ж заводы, якія загружаны адказнымі заказамі для хімі.

Улічваючы ўсё сказанае, лічу, што неабходна зацвердзіць план другой пяцігодкі ў 25 млн. цэнтн. цукру для 1937 года.

Па рыбнай прамысловасці ў разданым вам праекце намечана праграма ўлову рыбы для 1937 г. у 19 млн. цэнтнераў. Рост здабычы рыбы ідзе не шляхам роўнамернага павялічэння па ўсіх басейнах. У Азоўскім і Каспійскім басейнах ёсць ужо нейкая натуральная грань вылову. Бясспрэчна, можна і патрэбна шляхам рыбаразвядзення папаўнець ёмкасць і гэтых басейнаў і павялічыць здабычу рыбы.

Але гэта, паперчае, патрабуе значнага часу і, падрутое, абмяжоўваецца цяперашнім узроўнем тэхнікі гэтай справы. Практычна, беспрадзельным басейнамі з'яўляюцца наш Далёкаўсходні берег Цихага акіяна, Барэнцава і Белае моры Паўночнага Ледавітага акіяна. Тут, зразумела, дзесяткі год мы яшчэ сутыкнемся з пытаннем аб сырцовай базе. Але затое ва ўмовах акіянскага лову патрабуецца ўзбраенне навейшай тэхнікай, тралерамі і буйнымі матарызаванымі суднамі ў 100-200 сіл, каб лавіць рыбу не толькі ля берагоў, але і ў глыбіні мора. Наша прамысловасць ужо асвоіла вытворчасць тралераў і матораў для рыбнай прамысловасці, але выробляе іх яшчэ ў крайне недастатковых размерах, будучы занятая другімі, не менш важнымі заказамі. Але я баюся, што не ўсю неабходную нам колькасць тралераў і матораў рыбная прамысловасць зможа атрымаць ад цяжкай прамысловасці, імянна ў сілу аграмадных патрабаванняў да яе ўсіх галін народнай гаспадаркі. Нам патрабуецца мінімум 50 новых тралераў і 10-12 тыс. шт. рыбалоўных суднавых рухавікоў.

Павялічэнне здабычы на берагах Ледавітага і Ціхага акіянаў звязана з асваеннем новых ненаселеных раёнаў, там патрэбны не толькі новая тэхніка, але з ёю і перасяленне людзей у гэтыя раёны, будаўніцтва для іх жылля і іх гаспадарчае ўпарадкаванне для паставшнага засялення. Даволі прывесці прыклад, што, асвойваючы Камчатку, мы за пяцігодку патроілі яе насельніцтва, пабудавалі невялікія гарады. Усё гэта патрабуе шмат часу, шмат сродкаў і напружанай работы. У сувязі з усім гэтым я прапоную прапанову ўстанавіць для 1937 г. лічбу вылову ў 18 млн. цэнтнераў. Зараз мы здабываем 13 з лішнім млн. цэнтнераў. Падымаючы для апошняга года пяцігодкі здабычу да 18 млн. цэнтнераў, мы атрымліваем рост амаль на 5 млн. цэнтнераў, г. зн. сярэдні прырост складае 6 млн. пудоў рыбы. Дабіцца такога павялічэння вылову будзе нелёгкай задачай для рыбнай прамысловасці.

Лічу неабходным унесці паправку і ў адносінах мылаварнай прамысловасці. Уся вытворчасць мыла ў 1932 г. складала 357 тыс. тон, з іх 42 тыс. тон саматужна-прамысловай каапераціі, астатняе ставала дзяржаўная прамысловасць. У праекце плана, які вам раздан, запісана 1,21 млн. тон мыла для 1937 г. Я прапаную зацвердзіць для апошняга года пяцігодкі праграму ў мільён тон мыла, г. зн. давіцца без спалата патраення вытворчасці. Гэта будзе гігантская лічба. Яна патрабуе будаўніцтва новых мылаваранных заводаў у радзе раёнаў. Мылаварныя заводы нельга будаваць у адным пункце, каб не было лішніх перавозак мыла па краіне. Калі т. Сталін прапанаваў перадаць мылаварную прамысловасць ад Наркомлеспрома Наркомснабу, ён прапанаваў заняцца пабудовай раду новых мылаварных заводаў, за што мы ўжо ўзяліся. Тым часам цяперашняя дзяржаўная прамысловасць, пры поўнай яе загрузцы сырцом, зможа выпрацаваць толькі 600 тыс. тон, г. зн. даць падаўнае прадукцыі, а каб атрымаць патраенне, трэба пабудаваць вялікую колькасць новых заводаў. Мы іх, вядома, пабудуем, але, улічваючы ўсё гэта, а таксама ўлічваючы залежнасць мылаварнай прамысловасці ад расліннага тлушчаў, прашу з'езд зацвердзіць план для 1937 г. у 1 млн. тон мыла.

У адносінах расліннага тлушчаў у праекце плана на 1937 г. закладзена 850 тыс. тон. Гэта ў два разы больш, чым цяпер. Такое павялічэнне вытворчасці будзе залежаць не толькі ад росту зборaў слашчэнка, бавоўнянага і ільнянага насення. Каб пераапрацаваць іх, мы павінны пабудаваць рад буйнейшых маслабойных заводаў. Ужо сёння пуд колькасць бавоўнянага масланасення, якую мы маем у Сярэдняй Азіі, мы з трудом пераапрацоўваем, бо тэхнічная база маслабойнай прамысловасці недастаткова вырасла. Мы плацім будаўніцтва экстракцыйных заводаў — гэта апошняе слова навейшай тэхнікі. Яны прапускаюць не старым метадам прасавання насення, які не дае поўнай выжымкі з іх тлушчу, а куды больш эфектыўным метадам хімічнай экстракцыі. Асваенне гэтых заводаў таксама патрабуе вялікіх намаганняў і часу. Уліку прапанову ўстанавіць для 1937 г. 750 тыс. тон расліннага масла. Пры патраенні вытворчасці каўрэга масла мяркуемыя тэмпы росту па расліннаму маслу цалкам забяспечаць і рабочае снабжэнне і мылаварную вытворчасць.

Таварышы, я павінен звярнуць вашу ўвагу на тое, што ў росце харчовай прамысловасці вялікую ўдзельную вагу будзе займаць мясцовая прамысловасць. Тав. **Сталін** на гэтым з'ездзе зрабіў асаблівы націск на росце мясцовай прамысловасці і паставіў у рад чарговых задач задачу — развязаць мясцовую совецкую прамысловасць, «... аказаць ёй магчымую дапамогу сырцом і сродкамі». Вытворчым наркаматам і вам, партыйным кіраўнікам на мясцах, неабходна сур'ёзна паклапаціцца аб разгортванні мясцовай прамысловасці, у асаблівасці па такіх галінах харчовай прамысловасці, як кандзіцерская, макаронная, піваварная, безалкагольная і інш., якія знаходзяцца ў веданні рэспубліканскіх, абласных і краёвых трэстаў. Па гэтых галінах усе заданні па разгортванню вытворчасці павінны ажыццяўляцца пад непасрэдным кіраўніцтвам мясцовых арганізацый. З свайго боку, Наркомснаб усямерна ў гэтым дапаможа. Мы не павінны дапусціць захаплення буйнымі прадпрыемствамі ў радзе галін харчовай прамысловасці, у асаблівасці тых, якія працуюць на мясцовым сырцы. Трэба шырока разгарнуць пабудову дробных і драбнюткіх прадпрыемстваў па пераапрацоўцы гародніны, па вытворчасці фруктовых вод і т. д. і т. п.

Пры зацвярджэнні ўсіх прапанаваных удакладненняў рост харчовай прамысловасці выразіцца для 1937 г. больш чым на 270 проц., г. зн. у 2¾ разы. Вядома, пры складанні чарговых гадавых планаў, па раду галін можа быць прынята павялічэнне заданняў на базе ўліку тых поспехаў, якія будуць дасягнуты.

Прыняўшы другі пяцігадовы план, усім нам, усёй партыі трэба паўдарнаму, пасталінскаму ўзяцца за разгортванне тэхнічнай базы ўсёй прамысловасці, у тым ліку і харчовай прамысловасці, за перабудову яе на аснове новай тэхнікі, каб забяспечыць у другім пяцігодзі выпуск прадукцыі ў 2¾ разы больш па колькасці і за многа раз лепш па якасці (**доўгія апладысменты**).

АБАВЯЗКОВЫЯ МЯСАПАСТАЎКІ

Да тэрміну выканаем план адгрузкі мяса Ленінграду

Поўнае і акуратнае выкананне плана мясапаставак дзяржаве мае выключна важнае палітычна-гаспадарчае значэнне — ад гэтага залежыць бесперабойнае снабжэнне рабочых цэнтраў і Чырвонай арміі мясапрадуктамі.

Закон аб пастаўках мяса цвёрды і непахісны. Нікому недазволена павялічваць або змяншаць дзяржаўныя заданні. Своечасовае і поўнае выкананне плана — кроўны абавязак кожнай нашай арганізацыі, кожнага раёна, сельсавета і калгаса.

Важнейшай, неадлучнай часткай паставак мяса з'яўляецца **адгрузка Ленінграду.** У 1-м квартале трэба адгрузіць гораду Леніна 3500 тон.

У мінулым годзе БССР з гонарам выканала свае абавязацельствы перад ленінградскімі рабочымі, да тэрміну скончыўшы адгрузку бульбы. Рабочыя і калгаснікі Совецкай Беларусі паказалі поўнае разуменне імі сваіх абавязкаў перад буйнейшым пролетарскім цэнтрам Саюза. Задача паспяховага завяршэння адгрузкі мяса Ленінграду — новы адказны экзамен для працоўных БССР.

У сваім выступленні на 17 з'ездзе ВКП(б) сакратар ленінградскага абкома партыі тав. **КІРАЎ** падрабязна ахарактарызаваў значэнне снабжэння Ленінграда сельгаспрадукцыяй.

«**Я думаю, што дапамагчы нам трэба, тым больш, што на нас ляжаць вельмі вялікія задачы. Вы ведаеце, што ў справе індустрыялізацыі Ленінград адыгрывае вылучна адказную ролю. Няма ні аднаго месца, няма ні аднаго кута ка ў Совецкім Саюзе, куды-б не ішла прадукцыя ленінградскай прамысловасці... Гэтаму слаўнаму гораду дапамагчы не грэх. Праз адзінцва гады, калі вы нам крыху будзеце дапамагаць... Кожны год усё менш і менш, мы станем на свае ўласныя ногі, і ў гэтых адносінах у нас няма ніякіх сумненняў**».

Вялікае значэнне снабжэння Ленінграда мясапрадуктамі не ўлічылі многія нашы раёны. Аб гэтым гаворыць той факт, што **квартальны план адгрузкі мяса выканан па БССР да 5-га лютага толькі на 20 проц.** Ёсць раёны — **Рэчыцкі, Лепельскі** і інш., якія яшчэ не выканалі ні аднаго процанта задання. **Гомель** даў толькі 5 проц.

Магілеўскі раён замест 400 тон адгрузіў у студзені толькі 40. На Магілеўшчыне паўтараюцца памылкі мінулага года, калі большасць сельсоветаў месяцамі не выконвала квартальных планаў па ставках і ўзварушвалася толькі ў канцы квартала — пачыналіся «штурмы» і мітусня. Гэту сістэму ярка характарызуюць [illegible] старшыні **Таранаўскага** сельсавета, які заявіў: «Мясапастаўкамі мы зараз займацца не будзем, трэба здаць лён».

Жлобінскія РК і РВК адмовіліся паслаць на вёску ўпоўнаважаных па мясапастаўках, «бо раён занят іншымі кампаніямі». У выніку мяса Ленінграду не грузіцца.

Такія адносіны да паставак мяса, у прыватнасці, да адгрузкі Ленінграду, сведчаць аб злачынным ігнараванні дырэктыў партыі і ўрада.

А тое, што справіцца з заданнем можна датэрмінова, поўнасцю даказвае вопыт **Барысаўскай і Касцюковіцкай** міжраённых кантор Заготжывёлы, выканаўшых да 40 проц. квартальнага плана.

Поспех можа быць забяспечан толькі пры ўмове рашучага ўдару па сабатажу паставак, па кулацкай агітацыі супроць здачы мяса, па апартуністычнай практыцы ў правядзенні важнейшай кампаніі.

Наркамснаб СССР абвясціў усесаюзны конкурс на датэрміновае выкананне плана паставак і адгрузкі мяса. **БССР павінна неадкладна ўключыцца ў гэты конкурс.** Шырокае разгортванне соцспаборніцтва паміж усімі раёнамі, сельсоветамі і калгасамі забяспечыць пераможнае завяршэнне паставак і адгрузкі **Н.**

ЛЕНІНГРАДСКАЯ БРЫГАДА ВЫКЛІКАЕ

Брыгада Ленінградскага абласнога камітэта ВКП(б), прыехаўшая ў БССР для ўзмацнення паставак і адгрузкі мяса Ленінграду, бярэ на сябе ў парадку соцспаборніцтва абавязацельства: дабіцца поўнага выканання дзяржаўнага плана паставак і адгрузкі мясапрадуктаў у тых раёнах, да якіх брыгада будзе прымацавана.

Брыгада выклікае на соцспаборніцтва ўсіх упоўнаважаных ЦК КП(б)Б па пастаўках і адгрузцы мяса, а таксама адказных работнікаў Наркамснаба БССР, Белзагатжывёлы, Белмясапромтраста і работнікаў гэтых сістэм на мясцах.

Брыгадзір Ленабкома ВКП(б) **КАЛІНЧАНКА.**

НЕ ТРАЦІЦЬ НІ АДНАГО ДНЯ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ

Выкрыць „чэсных балбатуноў", патураючых падрыўной кулацкай дзейнасці

(Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта)

МСЦІСЛАЎЛЬ. Мсціслаўшчына ў мінулым годзе ганебна адставала па ўсіх сельскагаспадарчых кампаніях: зрыў тэрмінаў веснавой сяўбы, запяжка ўборачнай кампаніі і, нарэшце, адставанне з выкананнем плана ільназагатовак.

Насенныя фонды не засыпаны

Тое самае можна сказаць і аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы бягучага года. Які-б участак вы ни ўзялі, усюды сустрэнеце прарыў.

Узяць хоць-бы ссыпку і ачыстку насення. Як абстаіць справа на гэтым важнейшым участку? Надзвычай дрэнна. Вось лічбы, якія пацвярджаюць гэта. Насенны фонд яравых-зернавых на 1 лютага на калгасным сектару быў засыпан толькі на 72,2 проц., ільнянога семя на 64,4 проц., канапель на 71,8 проц. Што датычыць страхавога фонда, то апошні ссыпан усяго толькі на 24,9 проц.

Амаль усё ссыпанае зерно яшчэ не ачышчана. Так што па сутнасці лічыць яго ссыпаным нельга.

Якія-ж прычыны такога ганебнага прарыву?

— Запяжка малацьбы, — імкнуцца зладзіць сваю віну кіраўнікі райземаддзела.

Але хто як не яны самі вінаваты ў гэтым. Занятыя апрацоўкай ільнатрасты і выкананнем плана ільназагатовак, раённае кіраўніцтва зусім забыта аб малацьбе, лічачы гэтую справу другарадным.

У калгасе «Ключ волі», Рылаўскага сельсавета, патрыклад, яшчэ не абмалочана каля 100 вазоў жыта, столькі-ж аўса і ячменю. І няма нічога дзіўнага, калі ў свірнах гэтага калгаса няма ніводнага цэнтнера насення. Калгас знаходзіцца ў раёне дзейнасці МТС. Таму вялікая доля віны ў запяжцы малацьбы падае і на яе кіраўнікоў. Загатчык вытворчым участкам МТС тав. **Каплада**, у апраўданне сваёй бяздзейнасці імкнецца ўсю віну ўскласці на калгас, які нібыта сабатаваў механізацыю малацьбы, у той час як складаная малатарня з прычыны неспраўнасці трактара прастаяла ў калгасе больш двух тыдняў, пасля чаго была зусім забрана. Тое-ж самае і ў калгасе імя 1-га мая. Там таксама поўскладаная малатарня прастаяла больш тыдня, таму што МТС не забяспечыла трактар гаручым.

Запяжка малацьбы, тармозіць і размеркаванне ўраджаю па працадняхпаміж калгаснікамі. Трудна знайсці ў раёне такі калгас, дзе-б было скончана размеркаванне ўраджаю. Справа даходзіць да таго, што калгаснікаў авансіруюць па некалькі раз, добра не ведаючы, колькі-ж прыйдзецца на працадзень.

Стайні даверылі кулакам

Дрэнна справа і з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы каня — асноўнай цягавай сілы ў раёне. Ужо адзін той факт, што конскае паталоўе ў 1933 годзе зменшылася амаль на 4 проц., сведчыць аб вельмі сур'ёзным становішчы. У некаторых калгасах ужо зараз амаль усіх коней трэба ставіць на адпачынак, з прычыны іх слабасці.

Узяць той-жа самы калгас — «Ключ волі». З 30 рабочых коней — 25 выведзены са строю ў рэзультаце абязлічкі, якая панае ў гэтым калгасе на ўсіх участках работы. Фармальна на паперы ўсе коні замацаваны за калгаснікамі і нават за тымі, якія ніколі на конях не працуюць. На справе-ж аднаго і таго-ж каня запрагае хто папала. Самы лепшы конь у калгасе даведзен да найгоршага стану, прычым вінаватага знайсці нельга. Але калі праўленню калгаса падае і ўдасцца выкрыць вінаватага, то ўсё роўна ніякіх мер уздзеяння не прымаецца. Нядаўна калгаснік **Максімяка Влас** збіў спіну двум коням. Аб гэтым ведаюць усе калгаснікі, але праўленне маўчыць.

Каму-ж даверан догляд коней, хто тут на чале калгаса?

Старэйшы коніх **Пратасевіч Антон** — былы кулак. Яго памочнік **Пічкуроў** — былы цвёрдазаданнік. Старшыня калгаса **Касцянкоў**, давёўшы калгас да развалу, уцёк невядома куды. Яго родны брат **Касцянкоў В.** — член праўлення, пра [illegible] калгаса фактычна прадаўжае разваліваць калгас далей. Кладаўшчык, брыгадзіры, старшыні і брыгадзіра, таксама члены праўлення. Старшыня рэвізійнай камісіі **Барысаў** — сын кулака.

Што-ж робіць раённае кіраўніцтва для аздаравлення калгаса «Ключ волі». Замест ушчэмлення кулацкага агента Касцянкова новым старшынёй прыслан Лапуцевіч, які быў асуджан да года прымусовых работ за бестаспадарчасць у калгасе «Чырвоны партызан». Можна сабе ўявіць, што зробіць такі «кіраўнік» у галіне арганізацыі работы.

Нельга абыйсці такога важнага участка падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, як рамонт с.-г. інвентара. У райземаддзеле ёсць план рамонта, учот кузняй у раёне і нават расклад, дзе, у якой кузні і які калгас павінен рамантаваць свой інвентар. Але ўся бяда ў тым, што гэты расклад пакуль што ляжыць без руху ў бюракратычных папках і калгасы аб ім не ведаюць.

Кіраўніцтва пасеўнай падмянілі бал атлёй

Асноўныя прычыны такога ганебнага адставання раёна ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы крыюцца ў зусім слабай мабілізацыі калгасных мас на барацьбу з класава-чужымі элементамі ў алсутнасці канкрэтнага і аператыўнага кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам з боку райкома партыі, які жывую, канкрэтную работу падмяняў канцылярска-бюракратычнай пісанінай і славесна-дэкларатыўнай балбатнёй.

Карыстаючыся прытуплеццем класавай пільнасці з боку партарганізацыі, класавы вораг — кулакі і іншыя антысовецкія элементы, прабраўся ў рад калгасаў раёна і вядзе там падрыўную работу. У калгасе **«Чырвоны Окцябр»**, Хлыпчоўскага сельсавета, праўленне — былыя кулакі. Старшыня калгаса **Батвіновец**, разбазарыўшы калгаснае дабро, уцёк невядома куды. Калі новым старшынёй быў выбран дэмабілізаваны чырвонаармеец — комуніст тав. **Вінсяцкі**, то кулакі, члены праўлення, сустрэлі яго ў штыхі. Якое-б мерапрыемства не высунуў Вінсяцкі на абгаварэнне, кулакі — **Шыратаў** і інш. на чале з рахункаводам калгаса **Славінскім**, сынам былога прыстава — імкнуцца ўсімі сіламі сарваць яго.

Адчуваючы сябе бяссільным, тав. Вінсяцкі звярнуўся за дапамогай у райземаддзел да інструктара па кадрах тав. **Рагозіна**, але, замест дапамогі Вінсяцкі атрымаў адказ:

— Спыні ты бузіць, старшыня калгаса не начальнік над рахункаводамі.

Прыходзіцца толькі здзіўляцца, чаму ўсё гэта застаецца «непрыкмечаным» з боку райкома і райвыканкома.

Падрыхтоўка кадраў зрываецца

Падрыхтоўка нізавых калгасных кадраў — важнейшая задача. Аднак у Мсціслаўлі гэта пытанне яўна недаацэньваецца. Раённае кіраўніцтва ледзь здолела склікаць курсы брыгадзіраў-паляводаў у колькасці 50 чал., замест 70. Курсы павінны былі пачаць сваю работу 1 студзеня, а пачалі толькі 18-га, прычым сабралася не больш 30 чалавек. Ці можна чакаць ад курсаў, што яны дадуць тую карысць, якую ад іх патрабуюць? Зразумела, што не.

Заняткі на курсах праводзяцца саматужным спосабам. Ні па адной дысцыпліне няма распрацаваных праграм.

Памяшканне для аўдыторый курсаў не падрыхтавана. Ад холаду хоць ваўкоў ганяй. Слухачы ніколі не раздзяваюцца. У памяшканні вельмі цесна. Яшчэ горш з размяшчэннем курсантаў. Усе курсанты размешчаны па прыватных кватэрах і гэта ў той час, калі ў горадзе пустых памяшканняў, патрабуючых невялікага рамонту, хоць адбаўляй.

Аб чым гэта гаворыць? Перш за ўсё аб тым, што людзі не разумеюць усёй сутнасці падрыхтоўкі калгасных кадраў. Яны не разумеюць таго, што падрыхтоўка нізавых калгасных кадраў — справа сістэматычная, а не часовая.

Мсціслаўшчына — у мінулым перадавы раён — мае ўсе магчымасці для таго, каб і зараз выйсці на перадавыя пазіцыі, і змыць з сябе ганебную пляму чорнай лопіны. Патрэбна канкрэтнае і аператыўнае кіраўніцтва работай з боку раённых арганізацый, патрэбна мабілізацыя калгасных мас на барацьбу з класавым ворагам, на барацьбу за большэвізацыю калгасаў, за заможнае жыццё калгаснікаў. Гэтай барацьбы яш

Аб кантрактацыі ільну і канапель ураджаю 1934 года

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

...адпавядненасці з пастановай ...ад 11 студзеня 1934 г. і пас...ай СНК СССР ад 27 снежня 193... г., Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б **пастанаўляюць:**

1. Зацвердзіць на 1934 г. наступны план кантрактацыі ільну і канапель па БССР у колькасці:

	ільну: —	30,2 тыс. тон (у перавозе на валакно)
У тым ліку:	ільнатрасты —	67,5 тыс. тон
	ільнасемя —	26,0 » »
	пянькі —	3,0 » » (у перар. на валакно)
У тым ліку:	пенькатрасты —	4,1 » »
	пенькасаломы —	1,0 » »
	семя-канапель —	2,8 » »

...ля забеспячэння здачы па кантрактацыі паказанай колькасці ...пенькапрадукцыі абавязаць ...заготлён і Белкаапсаюз у дагаворах кантрактацыі ахапіць плошчы...сева ільну ў 240 тыс. га і ...ва канапель у 30 тыс. га.

Зацвердзіць наступны спрыт якасныя паказальнікі па кантруемай сыравіне:

...па ільнянай трасце: турбінны — 68 проц. — сярэдні № 1, 70, ...ельнай — 32 проц. — сярэдні № 1, а ўсяго па ільняной трасце — сярэдні № 1, 47;

...па пяньны — сыроцу сялянскай апрацоўкі кантрольны асартымент: 0 і 1 гатунку — 22 проц., другога гатунку — 47 проц., трэцяга гатунку — 31 проц.;

...па канапляной трасце і салотурбінай 70 проц. у сярэдняе ніжэй другога гатунку, скутанай — 30 проц., у тым ліку: ...гатунку — 50 проц., другога гатунку — 50 проц.;

...чыстата насення: ільну — ...проц., канапель — 94 проц.

Зацвердзіць прадстаўлены Упраўкамзаг СНК СССР па БССР ...кантрактацыі ільну і канапель ...па раёнах і сектарах.

...рапанаваць РВК у 5-ціцэнны тэрмін размеркаваць раённыя планы кантрактацыі ільну і канапель па калгасах і сельсоветах, забяспечыўшы давядзенне планаў пасева ільну і канапель па кожнага калгаса і агранасобных гаспадарак не пазней 20 лютага 1934 г.

...ды старшынь РВК і сакратароў РК КП(б)Б ускладаецца персанальная адказнасць за правільнае давядзенне планаў пасева і кантрактацыі да кожнага калгаса, сельсовета і вёскі, з поўным улікам умоў (глебы, папярэдніка, работай сілы і т. д.) кожнага калгаса і вёскі.

4. Ускласці правядзенне кантрактацыі ўсіх відаў прадукцыі ільну і канапель на сістэму Белзагатлён па 44 раёнах, а па 31 раёну — на спажывецкую кааперацыю ў якасці кантрагента Белканторы «Заготлён».

Кантрактацыя селекцыйнага насення ільну ад насеннавотчых пасеваў праводзіцца Белільнотраста радцэнтрам.

Кантрактацыю ільну і канапель закончыць не пазней 1-га красавіка 1934 года.

5. Устанавіць наступныя сярэднія паквартальныя нормы здачы (продажу) дзяржаве закантрактаванай прадукцыі ільну і канапель (у процантах ад гадавога плана здачы):

а) лён сялянскай апрацоўкі	2	80	18
б) ільнатраста	10	90	—
в) пянька сялянскай апрацоўкі	—	60	40
г) канапляная салома	—	100	—
д) канапляная траста	—	80	20
е) ільняное і канапляное семя	35	65	—

...аручыць Упраўкамзаг СНК СССР ...БССР дыферэнцыяваць тэрміны ...ы па асобных раёнах.

...Пакінуць мінулагодняя загатовельныя цэны на ўсе віды прадукцыі ільну і канапель ураджаю 1934 года.

Абавязаць НКЗ забяспечыць ...ны ўлік, рамонт, снабжэнне запчастямі і поўнае скарыстанне раней завезеных уборачных машын і ільнапенькамялак.

...краіны гэтага, абавязаць НКЗ ...ізаваць вытворчасць на мяс...мялак, трапалак, ільнамалатарняў і мальна-трапальных агрэгатаў, забяспечыўшы кожны калгас з пасевам ільну ў 10 га не менш, чым па адной з гэтых машын да 15 ліпеня 1934 года.

...Арганізаваць незабяспечаным ільняным пасевам канюшыны чамі, абавязаць усе калгасы, якія сеюць лён, вылучыць адпаведныя плошчы пад насенні канюшыны ў размерах, поўнасцю забяспечваючых абсеменнем пасеву канюшыны ў 1935 годзе па ...нятых севазваротах.

...Прапанаваць белканторы Заготлён уключыць у кантрактацыйны дагавор па ільну абавязацельства калгасаў засеяць канюшынай плошчу, вызначаную пасеўнымі планамі калгаса, і вылучыць канюшынныя насенні для забеспячэння насеннем пасеваў канюшыны ў 1935 г.

10. Абавязаць НКЗ, РВК, сельсоветы і старшынь калгасаў:

а) адвесці пад пасевы ільну ў першую чаргу канюшынішчы і ільну, узораную з восені, не дапускаючы пасева ільну па ільну, па аўсу, і па іншых культурах, пад якія ў 1933 г. не клалася ўгнаенне;

б) не пазней 1-га ліпеня 1934 г. поўнасцю адрамантаваць мачыльныя ямы, адрамантаваць і набудаваць сушыльні з тым разлікам, каб на кожныя 10 га пасева ільну ў калгасе было б не менш адной сушні (ёўні). Акрамя гэтага, НКЗ забяспечыць набудову па БССР 180 палепшаных пенькамачыльняў і 80 палепшаных калгасных пенькасушылак.

11. Абавязаць НКЗ, РВК і старшынь калгасаў неадкладна прыступіць да напрыхтоўкі пасеваў канапель, адводаў для іх годнай зямлі ў кожным паасобным калгасе з тым, каб у 1934 годзе забяспечыць добраякасны пасеў і ўраджай канапель.

З прычыны таго, што за апошнія гады пад канопліі адводзіліся непагодныя землі, а старыя канапляннікі і прысядзібныя ўчасткі, на якіх атрымліваліся добрыя ўраджаі, адводзіліся пад іншыя культуры, абавязаць РВК, сельсоветы і праўленні калгасаў да вясны 1934 г. вылучыць пад пасевы канапель старыя сядзібныя і прысядзібныя канапляннікі, якія ў апошнія гады ўгнойваліся і давалі здавальняючыя ўраджаі, а таксама зямельныя ўчасткі з пад канюшынішчаў, добра запраўленых тноем, замацаваўшы гэтыя ўчасткі для пасеваў канапель на 4-5 год.

12. У сувязі з недастатковасцю завозу мінеральнага ўгнаення пад пасевы канапель абавязаць РВК, сельсоветы і калгасы забяспечыць натуральным угнаеннем кожны гектар пасева канапель у размеры не менш 30-40 тон на гектар. Адказнымі за правядзенне гэтых мерапрыемстваў лічыць старшынь РВК, сельсоветаў і калгасаў.

13. Разам з кантрактацыяй пасеваў канапель у калгасах праводзіць кантрактацыю пасеваў канапель на прысядзібных участках, якія знаходзяцца ў індывідуальным карыстанні калгаснікаў.

Абавязаць МТС і праўленні калгасаў забяспечыць арганізацыйную і агратэхнічную дапамогу калгаснікам пры пасеве апошнічі канапель на іх прысядзібных участках.

14. Адпусціць пасеўнічыкам насенне ільну і канапель з забранага вапага фонда, як у абмен на звычайнае семя, так і шляхам продажу насення за грошы па загатавіцельнай цане з наднакай у размеры 15 проц. У парадку абмену за цэнтнер насення прымаць цэнтнер звычайнага семя, пры гэтым пасеўнічык даплачвае розніцу паміж цаной насення і загатавіцельнай цаной семя, здаваемага гаспадаркай у абмен. Пры водпуску насення ільну і канапель у парадку продажу даваць пасеўшчыкам крэдыт у размеры да 50 проц. да 15-га лістапада 1934 года.

15. Устанавіць выдачу (продаж) хлеба здатчыкам ільняного і канаплянага валакна, трасты і саломы ўраджаю 1934 года па наступных нормах (у сярэднім):

па ільну звычайнага пасева — у сярэднім 1 цэнтнер хлеба за 1 цэнтнер зданага валакна.

Па ільну селекцыйнага, розгага па сева — 2 цэнтн. хлеба за 1 цэнтн. зданага валакна.

Па пяньцы: для калгасаў — 1,5 цнт. за 1 цэнтн. валакна, а для адпаасобнікаў — 1,2 цнт. за 1 цнт. валакна.

Па селекцыйнаму семю — 30 кг. хлеба за 1 цэнт. семя.

УВАГА: хлеб адпускаецца кантрактантам у асноўных ільнаводчых і пяньказотных раёнах.

16. Абавязаць Упоўнаважанага Камітэта таварных фондаў і рэгуляваць гашлю вылучыць для завозу ў ільнаканапляводныя раёны прамтавары ў спецыяльным асартыменце (бавоўняныя — 50 проц., хусткі — 7 проц., шарсцяная тканіна — 10 проц., нітки — 3 проц., мыла гаспадарчае — 8 проц., махорка — 9 проц., калошы — 3 проц., абутак — 10 проц.) на суму не менш 18 млн. р. для продажу здатчыкам прадукцыі ільну і канапель ураджая 1934 г. Не менш 25 проц. гэтага фонда за весці не пазней 1-га мая 1934 г. для продажу кантрактантам ільну ў час веснавой сяўбы і апрацоўкі пасеваў.

17. Вылучыць для выдачы (продажу) праз сістэму Заготлён лепшым здатчыкам - кантрактантам ільну і канапель за датэрміновую здачу і лепшую якасць сыравіны тавараў на 4 млн. руб. (цукар, рыба, падкоўныя і буданічныя цвікі, вакопнае шкло, шынное і падкоўнае жалеза, вядроўкі, махорка, мыла гаспадарчае).

18. Устанавіць выдачу (продаж) праз сістэму Заготлён алею і макухі здатчыкам семя ільну і канапель на кожны здадзены цэнтнер семя па наступных нормах (у кілограмах):

	У 3 кварт. 1934 г.		У 4 кварт. 1934 г.		Да 1 сакавіка 1935 г.	
	Алей		Макуха			
	Семя ільну	Семка канапель	Семя ільну	Семка канапель		
Для калгасаў	3,2	4,3	4,5	9,0		
Для адпаасобных бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак	2,5	3,3	4,0	8,0		
Для насеннавотчых калгасаў і здатчыкаў селекцыйнага і гатункованага семя	5,0	5,0	7,0	10,0		

19. Хлеб, алей і харчовыя тавары, якія атрымліваюцца калгасамі ў парадку стымулявання пасеваў і загатовак ільну і канапель, цалкам, а прамтавары, — у колькасці не менш 80 проц. размеркоўваць толькі паміж калгаснікамі, фактычна працаваўшымі па пасеву, па праполцы, уборцы і апрацоўцы ільну і канапель, звыш таго, што гэтым калгаснікам прыпісваецца з агульнага размеркавання дахопаў (грашовых і натуральных) у калгасе.

20. Даць у 1934 годзе калгасам і агранасобным бядняцкім і сярэдняцкім гаспадаркам, якія сеюць лён і каноплі, наступныя ільготы:

а) усе пасевы ільну — даўгунцу па канюшынішчы, палоне, узоранай з восені, і па пасеках, а таксама усе пасевы канапель у гаспадарках, закантрактаваўшых свае пасевы, вызваляюцца поўнасцю ад сельскагаспадарчага падатка.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Узняць тэмпы перабудовы промкааперацыі

„...Задача заключаецца ў тым, каб разгарнуць далей совецкі гандаль, уцягнуць у гэту справу мясцовую прамысловасць...“ *(СТАЛІН)*

ПЕРШЫЯ КРОКІ

Пачынанне было зроблена аршанскай раённай газетай **«Ленінскі прызыў»**. Уключыўшыся ў паход за лепшае выкарыстанне мясцовых таварных рэсурсаў, абвешчаны «СКТ» і «Звяздой», газета пачала вывучаць наяўныя ў Аршаншчыне магчымасці для развіцця мясцовай прамысловасці. «Ленінскі прызыў» склікаў шырокую нараду зацікаўленых работнікаў і ведаючых людзей. На гэтай нарадзе быў усебакова абмяркован план бліжэйшых дзеянняў і намечана канкрэтная праграма работы. Рад мерапрыемстваў вырашана было ажыццявіць яшчэ да адкрыцця ўсесаюзнага з'езда партыі.

Узятыя абавязацельствы не асталіся на паперы. Аршанцы выканалі большую частку таго, што намячалі зрабіць да 25 студзеня. І ў рэзультаце — Аршанскі раён сустракае 17 з'езд партыі адкрыццём новых самаўжных промыслаў і расшырэннем некаторых існуючых арцеляў.

У Оршы арганізавана новая трыкатажная арцель. Для гэтага не патрабавалася якіх-небудзь асобных затрат. Промсаюз сабраў у швейных арцелях раёна нескарыстоўваемае імі абсталяванне для вырабу трыкатажа. Да гэтага абсталявання дадалі бяздзейныя панчошныя машыны закансерваванай майстэрні таварыства «Прыхільнік дзяцей», і новая трыкатажная вытворчасць пачала працаваць. Арцель яднае 60 чалавек. За год яна выпусціць панчох, шкарпетак і іншага трыкатажа на 65 тысяч руб. Вялікая частка сыроцу будзе набывацца ў парадку самазакупак.

Значна расшырана мясцовая канатна-вяровачная арцель **«Днепр»**. Без спецыяльных затрат павялічан выраб вяровак і чунь на 200 тыс. руб. Для гэтага прышлося толькі павялічыць лік працуючых на 100 чалавек. Ільнаапрацоўчыя заводы раёна цалкам забяспечваюць «Днепр» сыроцам.

У мястэчку Копысь абодпакалёная арцель арганізавала мэблевы цэх. На працягу года рынак атрымае 200 абедзеных сталоў і 1.000 крэслаў. Выраб мэблі ўжо пачаўся.

Арцель **«Чырвоны баявік»**, якая займаецца лесапіленнем, адкрыла цэх па вырабу палазоў, санак і калёс.

Значны зрух дасягнут у развіцці вытворчасці лесахімічных тавараў. Пушчаны два новыя саматужныя смалакураныя заводы, а 2 знаходзяцца ў стадыі арганізацыі. Усе чатыры заводы дадуць 60 тон шкіпідару, 280 тон драўлянага вугалю і 140 тон смалы (для вырабу калёснай мазі). Прыступлена таксама да вырабу паленшанай калёснай мазі ў саматужных арцелях раёна.

Гэтыя першыя крокі—паказальнік велізарных магчымасцяй, але не ўсе яны скарыстоўваюцца.

Аказалася, што трыкатажна-швейны промсаюз не абмежаваўся адкрыццём новай трыкатажнай арцелі, а пераглядзеў вытворчы план усёй сваёй сістэмы ў бок павялічання. У рэзультаце план павялічан да 13.451 тыс. руб. супроць плана мінулага года ў 13.106 руб. і фактычнага яго выканання ў 10.884 тыс.

Дрэўлесхімсаюз-жа большэвіцкіх вывадаў з указання тав. Сталіна аб падваенні і патраенні выпуску тавараў шырспажыву не зрабіў. Дрэўлесхімсаюз адкрыў некалькі новых цэхаў і смалакураных заводаў, але разам з тым пачаў закрываць частку існуючых арцеляй. Згорнуты такія важныя промыслы, як выраб драўляных лыжак, лапцей, кошыкаў са шчапы і т. д. І гэта ў той час, як сыроцу і рабочай сілы ёсць колькі хочаце.

Матыў — **«няма попыту, няма каму прадаць»**. У сапраўднасці справа стаіць далёка не так. У драўляных лыжках, лапцях і кошыках адчувае патрэбу нават Аршанскі раён, не гаворачы ўжо аб беларускім рынку ў цэлым. Што-ж датычыць трудзнасцяй у рэалізацыі гэтых тавараў, то гэта, галоўным чынам, тлумачыцца дрэннай работай і непаваротлівасцю самога саюза і яго сістэмы (нездавальняючая якасць, няўменне знайсці пакупца).

Адносіны паміж спажывецкай і саматужна-прамысловай сістэмамі носяць выключна вывадковы характар. Пастаянай дзелавой сувязі з саматужна-прамысловай кааперацыяй няма не толькі ў аршанскага ЦРК, але нават у аршанскага райсаюза, які лічыцца адным з перадавых у Беларусі. Больш таго, старшыня райсаюза тав. **ПЕСІН** адкрыта заявіў, што ён не хоча вазіцца з арцелямі і лічыць за лепшае завозіць тавары... з Дагбаса.

Сваё нежаданне мець справу з мясцовай прамысловасцю кіраўнік райсаюза вытлумачыў нездавальняючай якасцю прадукцыі арцеляй. Ён, аднак, не змог прывесці ні аднаго факта аказання райсаюзам практычнай дапамогі прамысловай кааперацыі ў паляпшэнні якасці і расшырэнні асартымента.

Тавараў мясцовай вытворчасці — вось чаго няма ва многіх магазінах і крамах Аршаншчыны. Іх няма выключна таму, што спажывецкая сістэма раёна злачынна ігнаруе мясцовую прамысловасць. Нават у магазінах Оршы рэдка калі можна знайсці шафу або буфет. Што ўжо гаварыць аб раёне!

У святле прыведзеных фактаў нічога няма дзіўнага ў тым, што калгасы, маючы магчымасць арганізаваць дапаможныя промыслы для вырабу шчапных і ганчарных тавараў, гэтых промыслаў не арганізоўваюць. Спажыўсістэма не ідзе насустрач калгасам і не дапамагае ім у гэтай справе (сродкамі, хоць-бы парадай у выбары асартымента).

Мясцовыя кааператары павінны зразумець, што аснову мярылам работы спажыўсістэмы будуць служыць паказальнікі скарыстання ёю мясцовых тавараў для развіцця совецкага гандлю.

Ф. ВЕЛЬ.

ПЕРАБУДОВА „НА ТАРМАЗАХ“

«Звязда» (ад 29 снежня 1933 г.) і **«СКТ»** (газета «Снабжение, кооперация и торговля» ад 3 студзеня) пісалі, што лясная кааперацыя БССР недадала ў 1933 годзе тавараў шырспажыву на суму каля 20 млн. руб. Лесахімпромкааперацыя Беларусіна вінна была даць прадукцыі на суму 50.433 тыс. руб., дала-ж усяго на 34.526,5 тыс. руб. (у нязменных цэнах). Раннейшае кіраўніцтва Белкаапслеспромсаюза не здолела забяспечыць аператыўнасць, канкрэтнасць у рабоце ўсёй сістэмы, не заўважала тых агіднасцяй, якія рабіліся ў сістэме.

Аднаўленае кіраўніцтва Белкаапслеспромсаюза (тав. Катаводаў) узялося за ліквідацыю прарываў, але і ў яго рабоце на сёнешні дзень ёсць буйныя недахопы і хібы.

Сістэма Белкаапслеспромсаюза мае тры планы на 1934 год, а па сутнасці няма ні аднаго.

У чым-жа справа? Адзін план складзен і спушчан сістэме ў снежні мінулага года. Паводле гэтага плана выпуск прадукцыі вызначан прыблізна ў размеры 51 млн. руб. Другі, — зацверджаны Дзяржпланам БССР (па прадстаўленню, зразумела, саюза), вызначае выпуск прадукцыі ў суме 42.469,7 тыс. руб. Трэці план — таксама дзяржпланаўскі, к якому добрыя дзядзькі з Белкаапслеспромсаюза вялікадушна дадалі яшчэ 1.433 тыс. руб. І другі, і трэці планы супроць плана 1933 года значна зменшаны. Пры большым талёвым азнаямленні з планамі мы ўбачым і другія «асаблівасці» іх.

Па трэцяму «плану» выпуск пляцення з лазы вызначаецца ў суме 2.025 тыс. руб. супроць 3.039 тыс. руб. у 1933 годзе, лыжка-пасудных рыбрабаў адпаведна на 47.500 руб. супроць 142.500 руб. Зменшан выпуск мэблі з 8.390 тыс. руб. да 8.000 тыс. руб., венскай у тым ліку з 3.630 тыс. да 2.200 тыс. руб. Зменшан таксама выпуск навучальна-мастацкіх прыбораў (дзіцячыя цацкі, спортінвентар, канцылярскія прылады) з 1.600 тыс. руб. да 400 тыс. руб. Такім чынам, замест павялічэння выпуску прадметаў шырокага спажывання Белкаапслеспром ідзе, як па ўсіх групах, так і асабліва па найбольш важных і рашаючых значаў рэзкае скарачэнне. Камментары, як кажуць, не патрэбны.

Калі вы звернецеся да кіраўнікоў аб'яднання з пытаннем аб прычынах такой, прасцей кажучы, ашуканасці, перад вамі высунуць рад прычын: няправільнае планаванне ў мінулым годзе, недахопы сравнёны і т. д., і т. д. Але зараз-жа гора-планавікі пачынаюць уласнай аброай сябе-ж біць.

— Для вырабу венскай мэблі, — скардзіцца тав. Катаводаў і інш., — адпушчана вельмі мала клёна, таму мы і скарацілі выпуск мэблі.

— Ну, ставім мы ім пытанне, — а ці намераны вы ў такім выпадку выкарыстаць унутраныя, мясцовыя рэсурсы, арганізаваць замену клёна для асобных дэталяй іншымі гатункамі дрэва?

Аказваецца, што аб гэтым і не падумалі. Не ўлічаны лясы мясцовага значэння, не ўлічана магчымасць атрымання клёна з дрыянога матэрыяла і, нарэшце, поўная магчымасць замены дэфіцытнага клёна ў радзе дэталяй, як, напрыклад, ножкі крэслаў, дубам, ясенем і т. д. У радзе іншых галін вытворчасці не ўлічана магчымасць і неабходнасць найбольш поўнага і рацыянальнага скарыстання матэрыялаў, абсталявання і адыходаў сваёй-жа вытворчасці.

Мы вышэй паказалі на заніжэнне плана выпуску культтавараў. Да гэтага трэба дадаць, што па плану не вызначана асваенне новых галін вытворчасці, як, напрыклад, музычных інструментаў. А сакратарыят і ўсё іншае тут-жа пад рукой: за беларускай ёлкай для музычных інструментаў (гітара, балалайка) прыязджаюць і з Ленінграда, і з Растова. Трэба адзначыць, што ў арцелі **«Метраінструмент»** прыступаюць да вырабу музычных інструментаў, але аб гэтым у кіраўніцтве Белкаапслеспромсаюза ...

...за ёць пакуль што «слабае» ўяўленне.

Змяншэнне плана выпуску культтавараў работнікі саюза тлумачаць, між іншым, затаўраваннем і дрэннай якасцю дзіцячай цацкі і канцылярскіх прылад. Гэта верна, але хто-ж, як не кіраўнікі сістэмы, вінаваты ў тым, што няма барацьбы за якасць, за высокамастацкую і ідэалагічна-вытрыманую дзіцячую цацку, што і дагэтуль арцелі, міжраённыя саюзы і сам рэспубліканскі саюз у гэтых адносінах амаль не звязаны ні з гандлюючымі арганізацыямі, ні з пролетарскай грамадскасцю.

Усё гэта сведчыць, што сістэма Белкаапслеспромсаюза і пасля аднаўлення кіраўніцтва перабудоўваецца яшчэ дрэнна, на тормазах.

Неабходна ў найкарацейшы тэрмін пераглядзець план 1934 года з мэтай павялічэння яго, трэба неадкладна ліквідаваць шматпланавасць. Для павялічэння праграмы 1934 года ў параўнанні з планам 1933 года (падкрэсліваем планам, а не фактычным выкананнем, якое складае вельмі нізкі проц. — як гэта прабуюць рабіць кіраўнікі Белкаапслеспромсаюза), усе магчымасці ў наяўнасці. Неабходна ўвесці ў вытворчасць рад новых галін (музыкальныя інструменты і інш.), пашырыць рад старых, спланаваць квартальныя задані ні звонкім сістэмы такім чынам каб лыжы выпускаліся не к вясне, як гэта мела месца ў мінулым годзе, а к пачатку зімы, каб сані былі гатовы ўжо летам.

Гэтым і ралам іншых пытанняў работы лясной промкааперацыі кіруючыя рэспубліканскія органы безумоўна павінны зацікавіцца. Лясная промкааперацыя рэспублікі павінна і можа выканець і перавыканаць ускладзеныя на яе задачы па павялічэнню выпуску высокаякасных тавараў шырспажыву ў другой пяцігодцы.

МІХ. Р.

Лісты з Беларэса

АСІНТОРФ МОЖА І ПАВІНЕН СТАЦЬ АСНОЎНАЙ АПАЛАВАЙ БАЗАЙ БЕЛДРЭСА

...узка-калейная лінія чыгункі на ...клм. цягнецца ад Белдрэса да ...баноў. Вакол на дзесяткі кілометраў раскінуліся балоты. Багацейшыя залежы торфу. Невычарпальная крыніца цеплавой энергіі. Эксплуатаваць гэтыя багацці, ператварыць іх у высока-каларыйны апал ...лікан Асінторф — вялікі завод у ...бнах.

Белдрэс — наш адзіны спажывец. Мы можам існаваць толькі як ...таўшчык торфу для першай беларускай раённай электрастанцыі» ...аўляюць работнікі Асінторфа.

Вось гэты адзіны спажывец даў ...б спыніць работу, калі-б ён спа...ваўся выключна на свайго асноўнага пастаўшчыка. Маючы ў сядзе пад бокам багацейшыя запасы ...лу, Белдрэс прымушаны штогадзіна клапаціцца аб завозе торфу ...ніх раёнаў БССР.

У 1933 г. асінаўскі торф задаваў толькі 20-25 проц. патрэбы стан...ыі ў апале. Дзесяткі тысяч тон ...ыходзіцца загатаўляць на заводах, знаходзячыхся на адлегласці ...сотню і больш кілометраў ад Белдрэса, перагружаць транспарт, адваць паражняк, траціць велізарныя сродкі на перавозкі — замест ...ынавых 24 руб. завоз тоны торфу ...ходзіцца звыш 60 руб.

Станцыі прыходзіцца пераплачваць на гэтым калі паўтара мільёны рублёў у год. Станцыя церпіць ...тыя перабоі ў дастаўцы апалу ...з недахопу вагонаў. Яна нарэшце не можа ў такіх умовах нарэльна працаваць.

Смалявіцкі завод «Чырвоны сцяг» ...вінен даць Белдрэсу 15 тыс. тон торфу. У IV квартале ён нічога не ...грузіў, у студзені даў толькі ...00 тон пры квартальным плане ...12000. Торфарцель імя Сталіна та...ж раёну дала 4 тыс. тон замест 15 тыс., між тым ёй адпушчана 100 тыс. руб. на арганізацыю ўласнага транспарту.

Чаму Асінторф не апраўдвае свайго асноўнага прызначэння? Дзе прычыны таго, што Белдрэс менш усяго адчувае работу Асінторфа? Самі работнікі торфазавода, калі іх запытваюць аб гэтым, сумна ківаюць на небаў: «яно вінавата. Калі-б не дажджы, мы...»

І сапраўды, работнікі Асінторфа больш займаліся «метэаралагічнымі назіраннямі», чым правільнай арганізацыяй торфаздабычы. **За іх працавала... пагода.**

Кіраўнікі торфазавода т. т. **КАРАНДЗЕЙ і ЭСТЭРКІН** не без гонару ўказваюць на вынікі 1933 г. Упершыню за 5 год завод амаль поўнасцю выканаў план здабычы машына-фармовачнага торфу — 100 тыс. тон замест 104. Але гэта была толькі Шырвана перамога. Цэлы шэраг спалі лепшы перыяд торфаздабычы, вельмі позна разгарнулі работы, не справіліся са своечасовым наборам рабочай сілы. І ў выніку **50 тыс. тон торфу засталося ляжаць у клетках і лентках**, яго не паспелі высушыць, заштабеляваць. **Белдрэс атрымаў толькі 50 тон з іх 15 тыс. выпрацоўкі 1932 года.**

А якасць вывезенага торфу — ні жэй усякіх кандыцый. **Вільготнасць яго вельмі высокая, часта дасягае 60-70 проц.**

Злачынна нядбайныя адносіны да сушкі прывялі да таго, што былі прапушчаны лепшыя месяцы — чэрвень-ліпень, сушку разгарнулі толькі ў жніўні і верасні. Якую карысць магла даць такая работа!

У балотах Асінторфа ляжыць безліч каштоўнейшага віда апалу — карчоў. Паводле дагавора, Асінторф павінен быў даць Белдрэсу 20 тыс. к/м карчоў, даў-жа толькі 1800. Карчы гінуць у балоце. Між тым варта было паставіць ля кар'ераў 10 цыркулярак, і станцыя атрымала-б высокакалярыйны апал.

Да гэтага трэба дадаць **зрыў выпрацоўкі фрэзернага торфу.** Здабыта яго 6 тыс. тон замест 60 тыс. Участкі не былі падрыхтаваны, водапрымальнік не адрэгуляваны.

У рэзультаце — запасы таварнага торфу на заводзе вычарпаны. Белдрэс прымушан скарыстоўваць торф з надзвычай вялікай вільготнасцю, які вельмі шкодна ўплывае на эксплуатацыйны рэжым станцыі. Калі-б Белдрэс меў торф нармальнай вільготнасці ў 35-40 проц., ён мог-бы смела працаваць толькі на адным гэтым відзе апалу. При цяперашніх-жа ўмовах станцыя на працягу 6-8 месяцаў прымушана спальваць 150 тыс. к/м дроў, 7 тыс. тон вугалю і 1500 тон мазуту. Не трэба даказваць, што завоз гэтых відаў апалу звязан з вялікімі трудаспямі і вялікімі тратамі лішніх сродкаў.

Інжынерна - тэхнічны персанал станцыі правільна адзначае, што вільготны торф толькі засмечвае топкі, ён незагараўшым пападае ў зольнік і разам з попелам выкідаецца на звалку. Тым не менш ім прымушаны карыстацца, бо топкі катлоў прыстасаваны да спальвання торфу і без яго працаваць нельга. Не будуць загружаны бункеры торфам, падае даўленне, пачнецца разгрузка, немінучы перабоі ў падачы энергіі.

І вось гэтага вялікага значэння Асінторфа ў забеспячэнні нармальнай работы станцыі не ўлічылі кіраўнікі торфазавода. **Не адчуваецца адказнасці за работу і ў падрыхтоўцы да новага сезону 1934 года.**

Праграма здабычы торфу гэтага года складае 160 тыс. тон (116 тыс. машына-фармовачнага і 44 тыс. фрэзернага). Завод яшчэ не прыступіў да карчоўкі і плінтоўкі балотнага масіва. План паглыблення канаў выканан толькі на 65 проц. Гэту работу можна было з поспехам правесці пасля сканчэння мінулага сезона, або праводзіць паралельна з горнадобычай. Капанне канаў зімой абходзіцца ў 2—3 разы даражэй, не гаворачы ўжо аб якасці працы.

Не падрыхтавана плошча для здабычы фрэзернага торфу. Канаўныя работы на гэтым участку выкананы на 55,5 проц. Не пачаліся работы па адрэгуляванню водапрымальніка. За мінулыя 5 год Асінторф ніяк не зрабіў, каб скарыстаць асігаванні на рэгуляванне р. Выдры, што дазволіла-б з поспехам выкарыстоўваць фрэзерны торф.

15-га верасня трэба было пачаць рамонт механічнага абсталявання завода. Пачаўся ён толькі ў лістападзе—са спазненнем на два месяцы. **План выканан на 55 проц.** Да рамонту 8 элеватарных машын зусім не прыступлена. Галоўны механік тав. **ВАВУЛА** і механікі ўчасткаў **ЕЛУГІН і КУРАЧКІН** менш усяго цікавяцца кантролем за ходам рамонту.

Звыш 4 тыс. чал. трэба навербаваць, каб задаволіць патрэбы Асінторфа ў рабочай сіле. Дагэтуль завод не прыступіў да арганізаванага набору рабочых, не гледзячы на катэгарычныя дырэктывы ўрада аб тым, што набор трэба разгарнуць з 15-га студзеня. Толькі 20-га студзеня на месцы камандыраваны работнікі завода для правядзення падрыхтоўчай работы. Кіраўніцтва Асінторфа не ўлічыла памылак мінулага года, калі ў першыя самыя спрыяючыя месяцы сезону не хапала рабочых. **А задавальненне завода рабочай сілай — рашаючая ўмова поспеху здабычы і сушкі торфу.**

Асінторф не падрыхтаваўся таксама да прыёмкі завербаваных рабочых. Існуючы жыллёвы фонд (баракі) задавальняе толькі 70 проц. патрэбы. У план будаўніцтва не ўключана пабудова сушылкі для спецвопраткі, а таксама рабочага клуба. Баракі знаходзяцца ў зусім недапушчальным становішчы: яны не ацеплены, стрэхі іх працякаюць, вокны без падвойных рам, не хапае абсталявання — рукамыйнікаў, тумбачак і т. д. Ці можна пры гэтых умовах гаварыць аб забеспячэнні паспяховага выканання плана?

Важнейшая задача тэхнічнай рэканструкцыі тарфянай прамысловасці — **пераход на новы спосаб здабычы — так званы «вялікі гідраторф».** У пастановах ліпеньскага аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б падкрэслена неабходнасць пераходу буйных заводаў на новы спосаб здабычы торфу ў бліжэйшы перыяд.

Асінторф яшчэ ў гэтым сезоне павінен быў увесці ў эксплуатацыю тры краны гідраторфу, якія-б маглі здабыць звыш 50 тыс. тон сухога торфу. Завод сарваў падрыхтоўку да ўстаноўкі крантаў. Ён прыступіў да работы толькі ў другой палове кастрычніка, выканаўшы задание на рыццю канаў і карчоўцы на 20-25 проц. Да гэтага часу не прыступлена да перабудовы падстанцыі і праводкі высокавольтнай лініі. Вось чаму Галоўторф прымушан быў адмовіцца ад увядзення ў гэтым годзе на Асінторфе новага спосабу здабычы.

Выключна дрэнная работа Асінторфа ў мінулым годзе **прывяла да вельмі цяжкага фінансавага становішча завода.**

Кантроль рублём якасці прадукцыі не мог не ўдарыць па прадпрыемству. Паколькі Асінторф паставляў прадукцыю высокай вільготнасці, ён цярпеў на гэтым вялікія страты. Толькі да 1-га студзеня ён уплаціў Белдрэсу штрафаў і скідак звыш 200 тыс. руб.

Планавы сабекошт тоны торфу складае 19 руб., выручай-жа завод ад рэалізацыі яго толькі 11 руб. 50 кап. Зараз гэта лічба павінна яшчэ больш зменшыцца. Таму Асінторф апынуўся ў такім становішчы, што ён жыве на датацыі, не мае сродкаў для разліку з рабочымі і пратэрмінаваў банку звыш 500 тыс. рублёў.

Вялікая доля віны падае тут і на **Белторф.** Завод не мае сродкаў на выкуп запчастак і іншых матэрыялаў, патрэбных для надыходзячага сезону. У той-жа час аддзел снабжэння Белторфа пастаўляе заводу рознае абсталяванне да «вялікага гідраторфу» з аплатай у першым квартале. Гэта абсталяванне некамплектнымі часткамі ўжо прыслана па 60 тыс. рублёў і мёртвым капіталам ляжыць на заводзе. А плаціць за яго трэба зараз.

Такі сумны малюнак работы Асінторфа. Хто-ж вінават у гэтым? У першую чаргу **кіраўніцтва завода,** якое незабяспечыла перабудовы ўсёй работы прадпрыемства.

Поўную адказнасць нясе і Белторф. Яго кіраўніцтва зусім не адчуваецца на заводзе. На працягу апошніх месяцаў ні дырэктар Белторфа тав. **КУЗНЯЦОЎ,** ні яго намеснік, ні галоўны інжынер тав. **СЦІПАНАЎ** на завод не выязджалі, ніякай канкрэтнай дапамогі яму не аказвалі. Між тым Асінторф—рашаючы і буйнейшы завод БССР, удзельная вага якога ў праграме Белторфа 33 проц. Яму Белторф павінен быў аддаваць выключную ўвагу. Гэта не зроблена. Белторф адарваўся ад завода.

Ужо 8 месяцаў як на заводзе няма дырэктара. Яго замяняе тав. **Карандзей,** які толькі і марыць аб тым, як-бы хутчэй вырвацца з Асінторфа. Няма і сакратара парткома, яго замяняе рэдактар шматтыражкі тав. **Эстэркін.** Галоўны інжынер завода тав. **Мілавідаў** яшчэ 3 месяцы назад павінен быў атрымаць новае назначэнне і таму ён адчувае сябе госцем на прадпрыемстве. Пытанне аб яго замене яшчэ не вырашана.

Як дапамагае кіраўніцтва Белдрэса свайму асноўнаму пастаўшчыку Асінторфу? Ці паклапаціліся яно аб тым, каб стварыць на балоце патрэбныя ўмовы работы? Не! Гэтага сказаць нельга. Пагаварыце з кіраўнікамі Белдрэса і Асінторфа. З абодвых бо[illegible] ...ы па чуеце абвінавачванні [illegible] смяротных грахах. Узаі[illegible] паміж абодвымі арг[illegible] усім непарэчныя. [illegible] ...ныя спрэчкі і канф[illegible] ...ружнай узгодненай работы. Няма ўвязкі ў арганізацыі наг

ПАДЗЕІ ВА ФРАНЦЫІ

КОМПАРТЫЯ АРГАНІЗУЕ ПРОЛЕТАРСКІ АДПОР ФАШЫСЦКАЙ РЭАКЦЫІ

ПАРЫЖ, 9 лютага (БЕЛТА).

Компартыя і комсамол апублікавалі адозву да ўсіх працоўных з заклікам сёння ў 8 гадзін вечара (па парыжскаму часу) дэманстраваць на плошчы Рэспублікі супроць фашысцкай рэакцыі. Выкрываючы здраду соцыял-фашысцкіх лідэраў, падрыхтаваўшых сваёй палітыкай «меншага зла» ўзмацненне рэакцыі, адозва заклікае ўсіх рабочых прыняць актыўны ўдзел у масавай палітычнай забастоўцы 12-га лютага пад лозунгамі: «За неадкладны роспуск фашысцкіх арганізацый. За неадкладны арышт К'яппа, лідэраў фашысцкіх арганізацый, а таксама віноўнікаў расстрэла рабочых дэманстрацый. Супроць крывавай дыктатуры капітала. За рабоча-сялянскі ўрад».

Усеагульная рэволюцыйная канфедэрацыя працы пастанавіла аб'явіць 12-га лютага ўсеагульную забастоўку на ўсіх прыватных і грамадскіх прадпрыемствах і на транспарце. Канфедэрацыя заклікае рабочых не паддавацца ні на якія манеўры соцыял-фашыстаў, ствараць на прадпрыемствах адзіны фронт, выбіраць стачкомы, выстаўляць канкрэтныя патрабаванні, праводзіць сумесна забастоўкі і дэманстрацыі на заводах і на вуліцах для барацьбы за свае патрабаванні. Зварот заклікае рабочых—членаў рэфармісцкіх і аўтаномных профсаюзаў аб'яднацца на мясцах з рэволюцыйнымі рабочымі.

Рэволюцыйная федэрацыя чыгуначнікаў таксама апублікавала зварот да ўсіх чыгуначнікаў з прапановай стварыць адзіны фронт для правядзення ўсеагульнай забастоўкі 12-га лютага пад лозунгамі барацьбы супроць фашызма і за істотныя эканамічныя патрабаванні.

Такога-ж роду адозвы выпушчаны і іншымі рэволюцыйнымі профсаюзамі.

БАРЫКАДНАЯ БАРАЦЬБА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

ПАРЫЖ, 8 лютага. (БЕЛТА).

Адначасова з падзеямі ў Парыжы ўчора ў правінцыі таксама адбываліся фашысцкія дэманстрацыі і магутныя рабочыя контр-дэманстрацыі.

НЕ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ПАЛІЦЭЙСКІ ТЭРОР

У Ліоне па закліку компартыі ў адказ на фашысцкую дэманстрацыю вышлі на вуліцу 8.000 рабочых і дэманстравалі пад лозунгамі адзінага фронта і барацьбы супроць фашызма. Адбываліся сутычкі паміж рабочымі дэманстрантамі і фашыстамі. Конная і пешая паліцыя абараняла фашыстаў ад абурэння рабочых, стрэляла ў дэманстрантаў-рабочых і пусціла ў ход шашкі. Рабочыя аказвалі ўпартае супраціўленне. У рэзультаце, згодна афіцыяльных даных, 84 раненых.

ВУЛІЧНЫЯ БАІ У ПРАВІНЦЫІ

У Дыжоне адбылася тысячная рабочая дэманстрацыя пад лозунгамі «далоў фашызм», «далоў К'яппа». Дэманстранты пабудавалі барыкады і на працягу двух гадзін аказвалі супраціўленне паліцыі.

У Ліле таксама адбыліся сутычкі паміж паліцыяй і дэманстрантамі, якія абараняліся каменнямі і цэглай. Ёсць раненыя. Арыштаваны 30 чалавек.

Рабочая дэманстрацыя адбылася таксама ў Грэноблі. У Панце выступілі 1.500 рабочых, якія разагналі фашыстаў.

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА ШОФЕРАЎ ПАРЫЖА

Адначасова з гэтым паведамляюць, што забастоўка 25 тыс. шофераў таксі ў Парыжы прадаўжаецца. Спробы прадпрыемцаў сарваць забастоўку пры дапамозе штрэйкбрэхераў праваліліся. Забастоўка прадаўжае аставацца ўсеагульнай. У радзе другіх гарадоў адбываюцца дэманстрацыі шофераў у знак салідарнасці з бастуючымі ў Парыжы шоферамі.

БАРЫКАДЫ НА ПЛОШЧАХ, АКОПЫ У ТЮЛЬЕРЫ

ПАРЫЖ, 8 лютага. (БЕЛТА).

Паведамляюць падрабязнасці ўчарашніх крывавых падзей. У Тюльерыйскім садзе рабочыя рылі акопы і аказалі паліцыі яраснае супраціўленне. Дырэктар муніцыпальнай паліцыі Маршан быў моцна збіт дэманстрантамі. На плошчы Камбон рабочыя пабудавалі барыкаду і доўга абараняліся яе ад паліцыі. Шмат раненых.

Жорсткая бойка адбылася і на Елісейскіх палях. На вакзале Сен-Лазар чыгуначнікі зноў выступілі і ўпарта біліся з паліцыяй. У радзе пунктаў адбываліся сутычкі паміж рабочымі і фашыстамі. Будынак морскага міністэрства, які фашысты прабавалі пазаўчора падпаліць, ахоўваўся каляровымі войскамі.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ

Не раз натоўп прабаваў прарвацца да міністэрства ўнутраных спраў і палаца прэзідэнта. Конная паліцыя з шаблямі нагола разганяла дэманстрантаў. Позна ноччу на трох цэнтральных плошчах прадаўжаліся жорсткія баі. Паводле афіцыяльных даных, арыштавана 486 чалавек.

НОВЫ ГАБІНЕТ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 9 лютага (БЕЛТА). Думерг стварыў габінет у наступным складзе: прэм'ер — **Думерг** (былы прэзідэнт рэспублікі), міністр замежных спраў—**Барту** (сенатар, член групы дэмакратычнага і радыкальнага саюза), міністр юстыцыі—**Шэрон** (сенатар, член групы радыкал-дэмакратычнай і радыкальна-соцыялісцкай левай), міністр унутраных спраў **Сарро** (сенатар, член той-жа групы), ваенны міністр—маршал **Петэн**, морскі міністр—**П'етры** (дэпутат, член групы рэспубліканскай левай), міністр авіяцыі — генерал **Дэнен**, міністр фінансаў—**Жэрмен-Мэртэн** (дэпутат, член групы радыкальнай левай), міністр народнай асветы—**Берто** (дэпутат, радыкал-соцыяліст), міністр гандлю **Ламурэ** (дэпутат, радыкал-соцыяліст), міністр калоній—**Лаваль** (сенатар, не належыць ні да адной групы), міністр земляробства—**Ксй** (дэпутат, радыкал-соцыяліст) міністр грамадскіх работ — **Фландэн** (дэпутат, член групы рэспубліканскай левай), міністр аховы здароўя—**Марэн** (дэпутат, член групы рэспубліканскай федэрацыі, крайні правы), міністр пенсій —**Револе** (сакратар федэрацыі былых франтавікоў, крайні правы), міністр працы — **Марке** (дэпутат, неосоцыяліст), міністр гандлёвага мораплавання — **Бертран** (дэпутат, радыкал-соцыяліст, міністры без партфеляў — **Эррыо** (дэпутат, старшыня радыкал-соцыялісцкай партыі), **Тард'е** (дэпутат, член групы рэспубліканскага цэнтра) і міністр пошт і тэлеграфу—**Малларме** (член групы радыкальнай левай).

ФАШЫСТЫ ТРЫМАЮЦЬ ДЗІМІТРАЕА Ў ПАДЗЯМЕЛЛІ

ВЕНА, 8 лютага. (БЕЛТА).

Высланы з Германіі балгарскі пераклічык Дуноўскі паведаміў прадстаўнікам друку, што яго высылка мае мэтай скрыць ад сусветнай грамадскасці становішча, у якім знаходзіцца ў турме Дзімітраў і яго таварышы.

Згодна паведамлення Дуноўскага, становішча арыштаваных балгар значна пагоршылася. Дзімітраў у сырой камеры ў падзямеллі і пазбаўлен магчымасці прадаваць, бо камера недастаткова асвятляецца. Прабыванне ў сырой камеры адбіваецца вельмі адмоўна на стане здароўя Дзімітрава. Тапеў хворы і ледзь ходзіць. Яму на час яды не даюць ножа і відэлкі. Палова за апошні час ніхто не бачыў.

Паводле слоў Дуноўскага германскія ўлады настойна шукаюць прычын для высылкі сваякоў арыштаваных балгар, якія (сваякі) знаходзяцца ў Берліне, бо, відавочна, яны апасаюцца, як-бы грамадская думка не даведалася, што ўмовы знаходжання Дзімітраў і іншыя балгары, значна горшыя, чым нават да судовага прыгавору.

СТО ГОД СА ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Д. І. МЕНДЭЛЕЕВА

У Акадэміі Навук БССР адбылося ўрачыстае пасяджэнне з удзелам прадстаўнікоў навуковых устаноў Менска, прысвечанае стагоддзю з дня нараджэння выдатнейшага вучонага—хіміка **Д. І. МЕНДЭЛЕЕВА.**

З вялікім дакладам аб Мендэлееве выступіў дырэктар хімічнага інстытута акадэміі тав. **КАЗЛОЎ**, які ахарактарызаваў навуковую творчасць вучонага хіміка і значэнне яго навуковых работ для соцыялістычнага будаўніцтва.

Гэтымі днямі ў Белдзяржуніверсітэце адбудзецца агульны сход студэнцтва і навуковых работнікаў, прысвечаны Мендэлееву. З дакладам выступіць праф. **НІКІФАРАЎ.**

Габінет прыродазнаўства Акадэміі Навук Беларусі выпусціў брашуру «Жыццё і навуковая творчасць Д. І. Мендэлеева».

Даклады аб Мендэлееве арганізуюцца на фабрыках і заводах Менска. 10-га лютага ў клубе металістаў — сход рабочых металапрацоўчых заводаў, на якім выступіць з дакладам праф. Нікіфараў. 13-га лютага—сход рабочых-будаўнікоў. Такія-ж даклады будуць прачытаны на сходах рабочых заводаў «Комунар» і «Большэвік».

***

ЛЕНІНГРАД, 8. У зале філармоніі адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае стагоддзю з дня нараджэння Д. І. Мендэлеева.

Сярод прысутных вядомы фізіёлаг акад. Паўлаў, выдатныя хімікі і фізікі СССР, увесь склад хімічнай асацыяцыі Акадэміі Навук — шлісельбуржец Марозаў, сын і пляменнікі Мендэлеева, а таксама выдатныя прадстаўнікі навукі і тэхнікі, рабочай грамадскасці, вучнёўская моладзь.

Урачыстае пасяджэнне адкрылася ўступным словам акад. **Карпінскага**, адзначыўшага заслугі геніяльнага вучонага перад чалавецтвам.

З дакладам выступілі **акад. Байкоў, праф. Шукароў і акад. Вавілаў.**

Акад. Байкоў у сваім дакладзе адзначыў, што Мендэлееву ўдалося занава стварыць хімію, якая да яго з'яўлялася разрозненай навукай. Яму ўдалося стварыць цэльную, адзіную сістэму хіміі і ў гэтым яго агромадная заслуга.

У часе даклада праф. Шукарова ў прэзідыуме з'явілася Анна Іванаўна Мендэлеева — удава вядомага вучонага. Зала сустракае яе гучнымі апладысментамі.

Акад. Вавілаў зрабіў даклад на тэму: «Сучасная фізіка і навуковая спадчына Мендэлеева».

АДОЗВА „ЮМАНІТЭ"

ПАРЫЖ, 8 лютага. (БЕЛТА).

«Юманітэ» апублікавала зварот да парыжскіх рабочых з заклікам сабрацца 9-га лютага на плошчы Рэспублікі і дэманстраваць пад лозунгамі: «За арышт К'яппа, роспуск фашысцкіх арганізацый супроць стварэння ўрада «нацыянальнага яднання», за рабоча-сялянскі ўрад».

«Юманітэ» заклікае пізанныя рабочыя арганізацыі к правядзенню палітычных стачак на аснове адзінага фронта з радавымі рабочымі-соцыялістамі і з пізанымі арганізацыямі соцыялістычнай партыі.

Далей адозва, зварачаючыся да радавых рабочых-соцыялістаў, выкрывае здрадніцтва кіраўніцтва соцыял-фашысцкай партыі, даўшага сваёй палітыкай супрацоўніцтва з буржуазіяй магчымасць умацаваць рэакцыю і падрыхтаваць стварэнне ўрада «нацыянальнага яднання».

«Компартыя, — гаворыцца ў адозве, — рыхтуе арганізацыю адзінага фронта. У адпаведнасці са сваімі ранейшымі прапановамі яна паўтарае, што гатова прыняць барацьбу з соцыялістычнымі арганізацыямі на час сумесных дзеянняў супроць фашызма і наступлення капітала, але будзе весці бязлітасную барацьбу з тымі, якія ў парушэнні ўмоў пагаднення аб адзіным фронце стануць штрэйкбрэхерамі і будуць падрываць адзіны фронт рабочага класа».

ЧАРГОВАЯ ЗДРАДА СОЦЫЯЛ-ФАШЫСТАЎ

Соцыял-фашысцкі «Попюлер» прабуе растлумачыць тэты зварот компартыі, як «адмаўленне ад ўсяка пагаднення», імкнучыся, такім чынам, ашукаць рабочых і замаскаваць чарговае здрадніцтва соцыял-фашысцкіх лідэраў.

Як паведамлялася, рэфармісцкая канфедэрацыя працы адмовілася прыняць прапановы компартыі і унітарных профсаюзаў аб сумесным правядзенні палітычнай дэманстрацыі 9-га лютага.

ФРАНЦУЗСКІЯ ФАШЫСТЫ

ПАРЫЖ, 8. У сувязі з падзеямі ў Парыжы, цікава прывесці даныя, якія характарызуюць дзейнасць фашысцкіх арганізацый ва Францыі. Перад адкрытым выхадам абнагледзі ўпай фашысцкай рэакцыі праводзіла грунтоўная падрыхтоўка ў другой. Акрамя адкрыта чорнасоценных газет — «Аксіон франс'эз», «Амілюсіль», «Фігаро», «Віктуар», — рад вялікіх палітычных газет — «Тан», «Эко дэ-пары», «Нотр тан», «Леберта» і т. д. — пад тым або іншым відам прапагандавалі фашысцкія ідэі, фашысцкія выданні.

У радзе выданняў («Рэв'ю франс'эз», «Маладая Еўропа» і інш.) адкрыта выказваліся сімпатыі рэжыму Мусаліні і Гітлера.

Матэрыялы, апублікаваныя ў фашысцкай «Ла лібр пароль» ясна на паміналі першыя крокі германскага фашызма з яго дэмагагічнай праграмай «барацьбы супроць фінансавага капітала».

Так, газета горасна шкадавала, што «ва Францыі, з нішчасцю, няма моцнага ўрада». У фашысцкіх лістоўках вялася прапаганда антысемітызма, нацкоўванне на замежных рабочых, скарыстоўваліся самыя нізкія інстынкты.

Побач з гэтым праграма фашысцкіх арганізацый змяшчае рад дэмагагічных патрабаванняў, разлічаных на здаваленне бяднеючых дробных буржуа (аграмаджанне буйных універмагаў і прадастаўленне іх у арэнду па таных цэнах дробным крамнікам і рамеснікам).

Найбольшую актыўнасць развілі старыя фашысцкія арганізацыі, як група «Аксіон франс'эз», «Камзо дю руа» («каралеўскія малодчыкі») і «Жэнес патрыётык» (Патрыятычная моладзь»), з нядаўна створаных —«Круа дю фу» («Агнёвы крыж»).

На сяле правадніком фашысцкай ідэалогіі выступае памешчыцка-кулацкая партыя. Скарыстаўшы нездаваленне працоўных сялян, руйнуемых аграрным крызісам, яна прабуе нацкаваць сялянства на працоўных горада. Пад сцягам аб'яднання ўсіх «сельскіх гаспадароў» для барацьбы супроць «калектывізма і індустрыялізма», супроць «буйнага капітала і манапольных цэн», аграрная партыя заклікае стварыць «аграрны блок», каб не дапусціць разгортвання класавай барацьбы на сяле. У канцы студзеня адбыўся з'езд аграрнай партыі, на якім быў распрацаван план далейшых дзеянняў.

Уплыў гатых фашысцкіх арганізацый на Францыі не трэба перацэньваць, але трэба адзначыць, што правыя групіроўкі, непасрэдна адбіваючыя інтарэсы буйнага фінансавага капітала і цяжкай прамысловасці (у прыватнасці група Тард'е), ахвотна карыстаюцца фашысцкай дэмагогіяй для барацьбы супроць рэволюцыйнага руху ў краіне і для арганізацыі рашучага наступлення капітала на жыццёвы ўзровень працоўных.

У апошні час і «левы» друк, які адбівае думку младарадыкалаў і колаў, якія стаяць блізка к Далад'е (як «Нотр тан»), прыкрываючыся такімі аргументамі, як «крах парламентарызма», «банкрутства дэмакратыі», патрабуюць фашызацыі дзяржаўных устанаўленняў і апарата.

Компартыя сістэматычна выкрывае сутнасць фашысцкай дэмагогіі, падкрэсліваючы, што так званая «дэмакратычная сістэма» ў капіталістычных краінах прадстаўляе сабой рознавіднасць дыктатуры буржуазіі. Разам з тым компартыя заклікае працоўных горада і сяла да стварэння адзінага фронта барацьбы супроць фашызма і наступлення капітала.

(БЕЛТА).

ПАВЕДАМЛЕННЕ АГЕНЦТВА СТЭФАНІ АБ РАТЫФІКАЦЫІ ІТАЛО-СВЕЦКАГА МЫТНАГА ПАГАДНЕННЯ

РЫМ, 8.

Агенцтва Стэфані паведамляе:

«Кіраўнік урада Мусаліні і паўпрэд СССР Пацёмкін абмяняліся ратыфікацыйнымі граматамі аб італа-совецкай мытнай канвенцыі, падпісанай 6-та мая 1933 года. Абмен ратыфікацыйнымі граматамі супадае з 10-й гадавінай устанаўлення нармальных дыпламатычных адносін паміж абодвума ўрадамі.

Паўпрэд СССР Пацёмкін выказаў задаваленне ўрада СССР з повазу ратыфікацыі акта, які ўмацоўвае пачуцці дружбы паміж абодвума краінамі, дружбы, якая можа разглядацца, як адзін з асноўных элементаў умацавання міру. Ён падзякаваў таксама за прыяцельскую садзейнасць, аказаную Італіяй у справе ўстанаўлення нармальных дыпламатычных адносін паміж СССР і Венгрыяй, якое адбылося нядаўна ў Рыме.

Мусаліні ў адказным слове на выступленне паўпрэда СССР заявіў аб гатоўнасці італьянскага ўрада прадаўжаць прыяцельскую палітыку ў адносінах СССР у галіне палітычнай і эканамічнай і выказаў пажаданне [illegible] 10-га [illegible] выкапан[illegible] паставак і а[illegible] у тых рабах[illegible] палітыка атрымала [illegible]чае развіццё».

Менск, друкарня «Звязды».

Паведамленне Дзяржаўн. польскага тэатра (Совецкая, 29, тэлефон 21-812)
Гастролі Маскоўскага Дзяржаўн. тэатра МУЗЫЧАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ
Мастацкі кіраўнік Валеры БЕБУТАЎ
12-га лютага—першы спектакль ШТРАУС.
ЦЫГАНСКІ БАРОН.
Білеты—у касе тэатра з 5 да 9 гадз. Па калектыўных заяўках білеты ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 гадз.

Дом Комуністычнай Асвяты
ПАВЕДАМЛЯЕ, што СЁННЯ, а 6-й гадзіне вечары, у памяшканні Дома Комасветы (вялікі з'езд, уваход з вул. Карла Маркса) АДБУДЗЕЦЦА
Лекцыя тав. Вольфсона
для парты і комсамольскага актыву на тэму: „Культура будучыгаяя соцыялізма і загніваючы капіталізм"
Після лекцыі—мастацкая частка.
Білеты раздаюцца па партыйных.
Неатрымаўшыя могуць атрымаць у канцылярыі Дома Комасветы.
Апошнячова паведамляецца, што ў Доме Комасветы кожны дзень да 7 ва 9 гадзін вечара адбываюцца кансультацыі па прапрацоўцы матэрыялаў —XV з'езда КПБ.Б і XVII з'езда ВКП б.
ДОМ КОМУНЕТЫ.

ДА ЎВАГІ ДЭЛЕГАТАЎ ГАРАДСКОЙ КАНФЕРЭНЦЫІ МЕНГОРРАБКОПА!
КАНФЕРЭНЦЫЯ МЕНГОРРАБКОПА
а. к. ыявецца 11 лютага ў 6 г. веч.
ў клубе ра отн'кэў казперацыі і дзяржгандлю
(б. клуб соўгандльслужачых)
Мандаты дэлегатам і запрашальныя білеты для калектываў будуць выдавацца ў праўленні МГРК (Совецкая 43 III паверх, пакой 4) 9 і 10 лютага з 9 г. раніцы да 3 г. дня, і з 7 да 11 г. вечара.
У дзень адкрыцця канферэнцыі мандаты будуць выдавацца з 4 г. вечара ў клубе.
Пасяджэнне фракцыі адбудзецца там-жа ў 5 г. вечара.
Праўленне МГРК

11 ЛЮТАГА у 12 гадзін дня ў залі пасяджэнняў Гарсовета (вул. К. Маркса, 14)
АДБУДЗЕЦЦА
ЗЛЁТ ГРАМАДСКІХ СУДОЎ
і ГРУП САДЗЕЙНАСЦІ ПРАКУРАТУРЫ Менскага раёну
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б і задачы калгасных судоў і групсадзейнасці (дакл. пракурора Рэспублікі т. Кузьміна).
2. Асноўныя мерапрыемствы па правядзенню веснавой пасеўнай кампаніі па раёну.
Менгорпракуратура.

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр
Сёння мастацкі фільм САЛДАЦКІ СЫН
Пачнуць к сеансу з 3 г. дня

Кіно ПРОЛЕТАРЫЙ
РЫЧАРД ТОЛМЕДЖ у гукавой камедыі ЗДЫМАЙ НА ПЛЯЖЫ

Кіно „СПАРТАК"
Усколы мастацкі фільм МУСУЛЬМАНКА
Я ана і 7 частках.

Кіно „Інтэрнацыянал"
Ад 9 лютага
ЖЭНІ ЮГО І АЎГУСТ ФРЭЙЛІХ
у замежным мастацкім фільме
КАРАБЕЛЬ НА МЯЛІ
У праграме кіно-хроніка САЮЗКІНО

Віцебскі Педагагічны Інстытут
АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ
на 6-месячныя падрыхтоўчыя КУРСЫ
для паступлення ў інстытут, на матэматычнае, фізічнае, біялагічнае і хімічнае адзяленні.
На курсы прымаюцца асобы з сярэдняй і нарэшце сярэдняй адукацыяй.
Апрача груп з выкладаннем на беларускай мове, будуць адкрыты нацгрупы з выкладаннем на яўрэйскай і рускай мовах.
Курсанты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй.
Прыём заяў у 15 лютага.
Адрас: Віцебск, Пушкінская 3, пед'інстытут.
Дырэктар пед'інстытута Чарнецкі.

Дзяржаўнае Аддзяленне Дзяржбанка
абвяшчае ПРОДАЖ
ЦУКРУ (пяску) камерсыйнага ў колькасці 3110,7 цэнт. на суму 40439 руб. 10 коп. апісанага ў Мазырскай базы Белгандля за пратэрміноўку пазыкі.

Дом Пісьменніка (Совецкая, 63)
СЁННЯ, 10 лютага ў 8 гадз. вечара
ВЯЛІКІ літаратурны ВЕЧАР
з дакладам праф. ПІОТУХОВІЧА
аб творчасці Міхася Чарота.
Уваход вольны.
Аргкамітэт ССПБ.

11 лютага, роўна ў 12 гадзін дня, у памяшканні дома Комасветы (клуб Карла Маркса)
адбудзецца
ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ-НАСТАЎНІКАЎ
школ г. Менска і раёна.
Модус прадстаўніцтва 1 ад 3-х правераных ударнікаў. Загадчык ФЗС, ЦКМ, старшыні МК і селькомаў у вызначаны тэрмін сумесна з абранымі дэлегатамі павінны акуратна к 12 гадзіне прыбыць на злёт.
Рэгістрацыя, выдача мандатаў, талонаў на харчаванне і начлег праводзіцца ў доме Комасветы з 9 гадзін раніцы да 12 гадзін дня. Пасля 12 гадзін рэгістрацыя дэлегатаў злёта праводзіцца не будзе.
Загадчык Гарана ЗЕНЬКОВІЧ.
Старшыня ГК саюза працасветы ВАДЭЙНА.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчае
набор на 6-цімесячныя курсы падрыхтоўкі ў інстытут.
На курсах будуць дзенныя і вечэрнія групы.
Курсанты будуць забяспечаны стыпендыяй і ставоўкай на агульных падставах з студэнтамі інстытута.
На курсы прымаюцца асобы, якія маюць адукацыю не ніжэй сямігодкі ва ўзросце ад 18 да 30 г.
Да заяў неабходна дадаць завераную анкету, пасведчанне аб асвеце, спраўку аб узросце, сацыяльнасці, сцвярджэнні і заяўкі.
Заявы прымаюцца да 10 лютага. Іспыты — ад 10 да 15 лютага.
Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу: Менск, Універсітэцкі гарадок, рабочаму факультэту медычнага інстытута.
Дырэкцыя

МЕНСК

НАПЯРЭДАДНІ XVI ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

МЕНСК рыхтуецца да гадавіны Чырвонай арміі. На фабрыках і заводах праводзяцца гутаркі і даклады. Разгорнута варашылаўская абаронная эстафета. Арганізаваны дзесяткі новых ячэек Асоавіяхіма.

Склікаецца ваенна-прафсакая канферэнцыя прадстаўнікоў прадпрыемстваў і гарнізона. 12-га лютага — агульнагарадскі злёт варашылаўскіх стралкоў.

23-га лютага, у дзень арганізуецца ваенізаваная лыжная вылазка за горад. Вечарам ў «Доме культуры» адбудзецца ўрачысты пленум Менскага гарсавета, прысвечаны 16-й гадавіне РСЧА.

24-га лютага—масавы ваенізаваны маскарад на стадыёне «Дынамо». У гэты-ж дзень у 1-й гадавіне для абудзецца закладка Дома Чырвонай арміі. У часцях гарнізона праводзяцца стралковыя і конныя спаборніцтвы з шырокім удзелам рабочых.

Аргкамітэт Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР падрыхтаваў да 16-годдзя Чырвонай арміі тры абагульнёкі мастацкіх твораў.

23 лютага ў менскім Доме Чырвонай арміі адбудзецца вечар сустрэчы членаў Дома вучоных з начскладам.

ЗІМОВАЕ ФІЗКУЛЬТУРНАЕ СВЯТА ПРОФСАЮЗАЎ

16-га лютага ў Менску пачнуцца ўсебеларускія зімовыя фізкультурныя спаборніцтвы профсаюзаў.

Для прэміравання перамогшага калектыва ЦСПСБ устанавіў пераходны сцяг, які будзе разыгрывацца на штогодна, пачынаючы з зімы 1934 года.

На прэміраванне і культабслугоўванне фізкультурнага свята ЦСПСБ адпусціў 3.000 руб.

РАЗДРОБНЫ ГАНДАЛЬ ХАРЧОВЫМІ ПРАДУКТАМІ

СНК БССР згадзіўся з прапановай НКСнаба аб выдзяленні з Белгандлю самастойнага спецыялізаванага гандлю НКСнаба «Белхарчгандаль».

На Белхарчгандаль ускладзен раздробны гандаль харчовымі таварамі (хлеб, вінна-бакалейныя тавары, гародніна, фрукты, безалкагольныя напіткі) у Менску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Магілеве, Барысаве, Оршы, Рэчыцы, Мазыры і Жлобіне.

Гэтай-жа арганізацыі перадаецца ад спажывецкай кааперацыі снабжэнне закрытых дзяржаўных устаноў (больніцы, яслі і інш.) у названых гарадах. За Белгандлем пакінуты функцыі гандлю промтаварамі па ўсіх гарадах і раёнах БССР, а таксама і харчовымі прадуктамі ў пунктах, якія не ўключаны ў сферу дзейнасці Белхарчгандлю. З агульнай сеткі крам Белгандлю значная частка перадаецца Белхарчгандлю. Сетка апошняга пашыраецца на 19 новых адзінак у Менску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Магілеве, Оршы, Мазыры, Рэчыцы і Барысаве.

ТЭЛЕГРАМА САСНОЎСКАГА У ЦК ВКП(б)

Масква, ЦК ВКП(б)

Гэтым заяўляю аб поўным, безагаворачным разрыве з контрэволюцыйным трацкізмам і гатоўнасці актыўна праводзіць палітыку партыі. Спадзяюся самаадданай работай пад кіраўніцтвам і кантролем партыі даказаць на справе шчырасць гэтай заявы.

ЛЕЎ САСНОЎСКІ.

Усебеларуская вытворчая радыёперакліч па разгортванню жывёлагадоўлі адкладваецца на 14 лютага

Паведамленні

Менская гарадская камісія па чыстцы партыі паведамляе, што 11 лютага ў 10 г. раніцы будуць разглядацца партсправы таварышоў:

Сарокін — ф-ка «Комунарка», **Наруцкі** — ВКСГШБ, **Фрыд** — Белкаапрамсовет, **Лысёнак** — калгас імя Фалько, **Харытановіч, Аўрусеня**—Новадворскі сельсовет, **Варушыла** — Гімеін, **Гравіт** — Белмяса, **Кугель**—ф-ка імя Кагановіча, **Гурэвіч, Мелянскевіч** — Саюзшвэйзбыт, **Кіпенворліц** — бульбяная станцыя, **Макась** — садова-гародні ін-т, **Брыскін** — Белсамупромсовет.

У выпадку няўкі, справы будуць перададзены ў архіў.

Менская горкамісія па чыстцы партыі.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 11-га лютага 1934 года ў г. Менску адбудзецца пасяджэнне Рэспубліканскай камісіі (дом Урада, правае крыло, 2-гі паверх, пакой 266) па разгляду апеляцый на рашэнні Уздзенскай, Рэчыцкай, Чэрвенскай, Мазырскай, Смалявіцкай, Шклоўскай, Мсціслаўскай, Чавускай, Гарадоцкай, Горацкай, Чашніцкай, Лагойскай, Віцебскай, Менскай, Асіпавіцкай, Пухавіцкай гарадскіх і раённых камісій наступных т.т.:

Шклоўскі раён

Паборпаў М. Т., Шчарбакоў П. П., Рыбакоў М. К., Казлоў С. К.

Уздзенскі раён

Пармон Ф. П., Терэшко Н. Д., Сватко Я. І., Левін Я. М., Заяц А. М.

Садоўскі І. І. (Асіпавічы), Хівук П. А. (Менск), Капыр М. І. (Віцебск), Петракоўскі П. З. (Лагойск), Кац Ф. М. (Чашнікі), Анціпенка М. П. (Горкі), Гурчэнка М. Н. (Гарадок), Мялеліна А. Д. (Гарадок), Елісеев М. С., Птушкін П. М., Мядзведзеў Е. І. (Чавусы), Блізнюк С. І., Валодзька П. Н., Іванов М. Г., Рагачоў А. Ф., Хаўратовіч В. А. (Чэрвень), Терэшкевіч З. (Пухавічы), Каган І. М., Сабалеўскі К. В., Корсак В. А., Васешко Т. Н. (Пухавічы), Цынман А. І., Мархонаў М. М. (Мсціслаўль), Стучынскі Л. М., Савасцянаў М. С., Казлоўскі Т. І. (Смалявічы), Савіцкі С. К., Ломжа А. Л., Кажэдуб А. С. (Мазыр) Барысюк Н. І., Астапенка С. А., Шпадарук П. І. (Рэчыца).

У сувязі з тым, што многія таварышы, падаўшыя апеляцыі, не гледзячы на неаднаразовыя іх выклікі, не з'явіліся, Рэспубліканская камісія папярэджвае, што справы не з'явіўшыхся будуць зданы ў архіў без разгляду.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Менгарком КП(б)Б і Гарпрофсовет склікаюць 10-га лютага 1934 года, з 7-й гадз. увечары ў памяшканні Дома Комасветы (пакой 12, уваход з вул. Энгельса) пашыраную нараду старшынь шэфкустоў і шэфчаек прадпрыемстваў і ўстаноў гор. Менска па пытанню аб падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.
ГОРПРОФСОВЕТ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Упаўн. Галоўлітбела № К—2411. РА